ЗАХАВАНАЯ ПАМЯЦЬ

МС





СЛОВЫ ПРА СКУЛЬПТАРА

11

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

13 ЛІСТАПАДА 2024 г.
СЕРАДА
№ 221 (30355)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

### КОРАТКА

• XXX Міжнародная спецыялізаваная аптовая выстава-кірмаш «Прадэкспа» праходзіць з 12 па 15 лістапада на пляцоўцы сталічнага Футбольнага манежа.

• У студзені — верасні 2024 года знешнегандлёвы абарот тавараў і паслуг Беларусі павялічыўся ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года на 5,6 працэнта — да $73,7 млрд.

• Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю скарэкціравала інструкцыю аб парадку ўстанаўлення і прымянення рэгуляваных цэн (тарыфаў).

• З пачатку года па садзейнічанне ў працаўладкаванні звярнуліся больш як 20,6 тысячы жыхароў Гродзенскай вобласці.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Аляксандр ВАЛЬФОВІЧ, Дзяржаўны сакратар Савета бяспекі:**

*«Людзі, прынамсі, за апошнія пяць гадоў ад мінулых выбараў, зрабілі сур'ёзныя высновы і ўрокі. У 2020 годзе Беларусь хацелі штурхнуць у прорву, стварыць прыкладна тую абстаноўку, якая на тэрыторыі Украіны. Гэта вельмі выгадна Захаду, і яны на працягу пяці гадоў спрабавалі гэта зрабіць. Але Прэзідэнт, кіраўніцтва краіны ўтрымалі і ўтрымліваюць нашу краіну. Беларусь дружалюбная, мірная краіна, якая хоча існаваць у міры і згодзе, у добрасуседскіх адносінах з усімі краінамі, у тым ліку ў адносінах да Польшчы, краін Балтыі і іншых дзяржаў. На гэта нацэлена палітыка Рэспублікі Беларусь».*

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «ЧАС АД СЛОЎ ПЕРАЙСЦІ ДА СПРАВЫ»

## Якія меры прапаноўвае беларускі бок для барацьбы са змяненнямі клімату

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выступіў на Сусветным саміце па барацьбе са змяненнем клімату ў Баку. Прамова беларускага лідара была лаканічнай, па рэгламенце яна не павінна быць большай за тры хвіліны, але трапнай, на злобу дня.**

«Тут вельмі шмат казалі аб тым, хто колькі зрабіў па паляпшэнні клімату. Але я параўноўваю апошні перыяд пасля папярэдняга нашага саміту. Стала толькі горш, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Вайна на Блізкім Усходзе, вайна ва Украіне, вайна ў Паўднёвым Емене. Усяго больш за 50 канфліктаў у свеце, якія жорстка ўплываюць на клімат на нашай планеце. Дык што, стала лепш? Хто пачаў плаціць за выкіды?»

Прэзідэнт падкрэсліў, што тыя, хто пачаў турбавацца найперш паляпшэннем клімату, адсутнічаюць на саміце. Больш за тое — сабатуюць. «Ці тое яшчэ будзе пасля (якія прайшлі. — **«Зв.»**) прэзідэнцкіх выбараў у Злучаных Штатах Амерыкі, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Паўстае пытанне: дык якая ж эфектыўнасць нашай дзейнасці на падобных samітах? Калісьці Прэзідэнт Францыі ледзь ці не вялікім сябе лічыў за Парыжскае пагадненне. І дзе гэты прэзідэнт сёння? Няўжо гэта не актуальна? Вось наша эфектыўнасць нашай працы. Так што рапартаваць пакуль няма пра што». Разам з тым беларускі лідар павіншаваў свайго калегу Прэзідэнта Азербайджана Ільхама Аліева з выдатнай арганізацыяй гэтага складанага саміту.

«Але тыя, хто сёння думае, што пранясе, адсутнічаючы на гэтым саміце... Не пранясе! Шторм у Злучаных Штатах Амерыкі, нядаўна




Фота БелТА.

Валенсія (гаворка аб паводцы. — **«Зв.»**) — загінулі людзі. Гэта сведчыць аб тым, як мы «паляпшаем» наш клімат. Я гэта шчыра кажу, таму што маю краіну папракнуць у гэтым плане няма за што. Мы жорстка выконваем усе абавязацельствы, якія ўзялі на сябе. Але пакольк з-за вось такога махровага бюракратызму Сакратарыята ААН за тры хвіліны практычна немагчыма сказаць нешта, я абмяжуюся літаральна некалькімі прапановамі», — сказаў беларускі лідар і коратка прадставіў прапановы беларускага боку па гэтым пытанні.

«Першае. Клімат змяніўся, гэта данасць. Таму першарадная задача — пераналадзіць нацыянальныя эканомікі, перш за ўсё сельскую гаспадарку, з улікам зменэных умоў, адаптаваць яе да новых умоў. Беларусь актыўна гэтай тэмай займаецца і гатова дзяліцца вопытам», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2

Актуальна

# У ІНТАРЭСАХ ЛЮДЗЕЙ

## З якімі праблемамі найчасцей звяртаюцца работнікі і якія шанцы адстаяць іх інтарэсы?



**Толькі з пачатку бягучага года прафсаюзныя юрысты выявілі больш як дзевяць тысяч выпадкаў парушэнняў працоўнага заканадаўства ў адносінах працоўных. Дзякуючы іх умяшанню грамадзянам вярнулі больш за тры мільёны рублёў — нявыплачаных ці незаконна ўтрыманых. Суды разгледзелі 55 іскавых дакументаў, падрыхтаваных юрыстамі прафсаюза, 11 чалавек былі аднаўлены на рабоце. Несвоечасовасць выплаты заработнай платы, немагчымасць звольніцца пры нежаданні працягваць, працоўныя адносіны з наймальнікам, незаконнасць дысцыплінарных спагнанняў — з гэтымі і іншымі пытаннямі звяртаюцца працоўныя ў прафсаюзныя арганізацыі. Пра тое, як яны вырашаюцца і на якую прававую дапамогу можа разлічваць работнік, а таксама пра заканадаўчыя ініцыятывы прафсаюзаў, якія сталі нормамі закона, расказала намеснік старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі Таццяна ФІЛІМОНАВА.**

СТАР. 4

Па палічках

# АДЗІНЫ МАЁМАСНЫ ПЛАЦЕЖ

## Яго неабходна заплаціць да 15 лістапада




**Як паведаміў начальнік Галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб Міністэрства па падатках і зборах Беларусі Андрэй КАВАЛЕЎСКІ, гэты адзіны плацеж складаецца з транспартнага, зямельнага падаткаў і падатку на нерухомасць. Спецыяліст адзначыў, што ў краіне выплату маёмасных падаткаў ажыццяўляюць больш за 3,5 мільёна фізічных асоб. Спецыяліст дадаў, што ў цэлым беларусы адказна падыходзяць да выканання сваіх фінансавых абавязацельстваў. Напрыклад, паводле інфармацыі на 5 лістапада, звыш 65 % нашых грамадзян ужо аплацілі маёмасныя падаткі.**

### Зручны алгарытм

Начальнік упраўлення нагадаў, што аплаціць цалкам маёмасныя падаткі за 2023 год неабходна да 15 лістапада гэтага года. Сёлета дзейнічае новы парадак аплаты фізічнымі асобамі маёмасных падаткаў і запазычанасці па іх. З 1 студзеня аплата фізічнымі асобамі транспартнага, зямельнага падаткаў і падатку на нерухомасць (маёмасныя падаткі) ажыццяўляецца адзіным маёмасным плацяжом на адзін бюджэтны рахунак па адрасе рэгістрацыі (прапіскі) фізічнай асобы. Да гэтага зямельны падатак і падатак на нерухомасць аплачваліся асобна, у тым ліку па кожным аб'екце нерухомасці, зыходзячы з яго месцазнаходжання. Андрэй Кавалеўскі адзначыў, што, па водгуках насельніцтва, грамадзяне ацанілі гэтыя нававвядзенні станоўча.

СТАР. 5

# «ЧАС АД СЛОЎ ПЕРАЙСЦІ ДА СПРАВЫ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Другая прапанова Прэзідэнта — дапамагчы краінам, якія развіваюцца, атрымаць роўны доступ да зялёных тэхналогій без шкоды для іх нацыянальных інтарэсаў. «Зрабіць так, каб яны ў выніку гэтай дапамогі не трапілі ў кабалу. Трэба адмяніць усё, што перашкаджае міжнароднаму гандлю тэхналогіямі, абмену інавацыямі і найлепшымі практыкамі», — сказаў ён.

«Трэцяе. Мы сёння ўжо сутыкнуліся з сітуацыяй, калі новая прадукцыя пазіцыянуецца як больш экалагічна бяспечная альтэрнатыва. Але ў той жа час наносіць не меншую шкоду. Аб'ектыўна патрэбны новыя падыходы да комплекснай ацэнкі патэнцыяльнага ўздзеяння інавацый на навакольнае асяроддзе на працягу ўсяго жыццёвага цыкла гэтай прадукцыі», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што гэтыя і іншыя кірункі патрабуюць кансалідацыі міжнародных намаганняў. «Не на словах, а на справе. Час ад слоў перайсці да справы. І той, хто павінен плаціць — павінен плаціць, а не адседжвацца ў сябе ў кабінетах», — падсумаваў ён.



Фота БелТА.

### «Усе даюць справаздачу, якія яны вялікія. А стала яшчэ горш»

Сваю пазіцыю Аляксандр Лукашэнка растлумачыў у кароткім інтэрв'ю журналістам пасля выступлення. Ён адзначыў, што арганізацыя саміту, які сёлета прымае Азербайджан, бліскучая. «Гэта адзінае, што можна ацаніць станоўча, але вельмі дорага», — адзначыў ён. Адказваючы на пытанне аб агульным уражанні, Прэзідэнт сказаў: «Агіднае. Я сказаў тэзісна, таму што з-за махровага бюракратызму Сакратарыята ААН гэта ўсё дарэмна. Ну што за тры хвіліны скажаш... Усе даюць справаздачу, якія яны вялікія. А стала яшчэ горш. Я ж назваў тры вайны, якія забруджваюць атмасферу. Хусітаў там цісНуць невядома за што, на Блізкім Усходзе вайна (перспектывы вялікія ўцягвання яшчэ іншых краін) і ва Украіне вайна. Гэта толькі буйныя. А іх больш за 50 — гэтых канфліктаў. Гэта забруджвае найперш атмасферу. Я казаў пра гэта ў Дубаі (на папярэднім падобным саміце год таму. — **«Зв.»**). І вытворцы. Хто больш за ўсё вырабляе — англасаксы. Дзе яны? Іх няма. Дзе спадар Макрон (Прэзідэнт Францыі. — **«Зв.»**), які так піярыўся на парадку дня гэтым — Парыжскае пагадненне. Дзе ён? Яго сёння няма нават. Яны па-наплявацельску да гэтага адносяцца. А гэта (на саміце. — **«Зв.»**) — проста гаварыльня чарговая», — дадаў беларускі лідар.

Кіраўніку дзяржавы таксама было зададзена пытанне, ці верыць ён у магчымасць спыніць войны. «Рэчаіснасць сведчыць аб адваротным. Таму я ў гэта мала веру», — адказаў Аляксандр Лукашэнка.

### «Адносіны з Сербіяй трэба інтэнсіфікаваць»

На палях саміту Прэзідэнт правёў і шэраг двухбаковых сустрэч. Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з Прэзідэнтам Сербіі Аляксандрам Вучычам.

«Трыццаць гадоў, як мы жывём у дыпламатычных адносінах. Нямала зроблена, але і ў нашым лёсе, і ў лёсе Сербіі адбыліся сур'ёзныя змены. Гэта ўсё перад вачыма. Тым не менш жыццё прадаўжаецца. Думаю, што нам трэба інтэнсіфікаваць нашы адносіны. Гэта дрэнна, што ў нас няма такіх інтэнсіўных адносін. Пры ўсіх нашых складанасцях. Яны, вядома, існуюць», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка прапанаваў спачатку задзейнічаць міжурадавую камісію — каб яе члены сабраліся, ажыццявілі рэвізію ў двухбаковых адносінах і падумалі, як і па якіх кірунках далей супрацоўнічаць. «Калі нешта за гэты час не патрэбна ў нашых адносінах, гэта трэба адкінуць, намеціць новыя шляхі. Але адносіны трэба не проста падтрымліваць. Пры ўсіх складанасцях трэба інтэнсіфікаваць», — сказаў беларускі лідар.

Пасля работы на ўзроўні міжурадавай камісіі Аляксандр Лукашэнка прапанаваў ажыццявіць візіт у Сербію беларускага прэм'ерміністра, і ў цэлым, паводле яго слоў, можна абмяняцца візітамі на ўзроўні ўрадаў. «Для таго, каб канкрэтызаваць план далейшых дзеянняў. І на вышэйшым узроўні мы маглі б потым ужо зацвердзіць усе прапановы», — растлумачыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

«Кірункаў супрацоўніцтва шмат. Я разумею Сербію і часта аб гэтым гаварыў, што вам складана, практычна знаходзіцеся ў акружэнні, ізаляцыі. З гэтага трэба зыходзіць і будаваць сваю палітыку. Але старых сяброў губляць нельга. Таму з Расіяй, Беларуссю падтрымліваць адносіны трэба. Гэта сапраўдныя сябры, глыбокія сябры, і ў гэтым кірунку, я думаю, у Сербіі будуць рабіць максімум», — разважаў беларускі лідар.

### «Беларусі і Зімбабвэ трэба яшчэ шмат чаго зрабіць»

Аляксандр Лукашэнка таксама сустрэўся з Прэзідэнтам Зімбабвэ Эмерсанам Мнангагвам. Кіраўнікі дзяржаў зверылі гадзіннікі па шэрагу пытанняў у развіцці двухбаковага супрацоўніцтва і перспектывах сумеснай работы на Афрыканскім кантыненце. Сустрэча праходзіла ў цёплай сяброўскай атмасферы. «Спадар Прэзідэнт, рады бачыць вас актыўным, жыццярадасным, нягледзячы на ўсе праблемы, якія ў нас існуюць у свеце», — прывітаў калегу Аляксандр Лукашэнка.

«І вам таксама мой камплімент. Цудоўна выглядаеце. І маладзей, вядома», — сказаў у адказ Прэзідэнт Зімбабвэ. «Ну, напэўна, не зусім», — заўважыў на гэта Аляксандр Лукашэнка.

«Ну, у параўнанні са мной вы, спадар Прэзідэнт, як юнак выглядаеце, — настойваў Эмерсан Мнангагва. — Мне 82 гады. Таму, гледзячы на вас, спадар Прэзідэнт, я бачу свайго маладога-маладога брата».

Аляксандр Лукашэнка ў сваю чаргу падкрэсліў, што нельга параўноўваць паўночных людзей з паўднёвымі. Апошнія, упэўнены Прэзідэнт Беларусі, значна больш эфектыўныя, актыўныя і здаравейшыя. «Мы збіраемся з вамі яшчэ жыць, і не адзін год, і нам давядзецца яшчэ нямала зрабіць», — падкрэсліў беларускі лідар.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў таксама аб ідэі пашырэння супрацоўніцтва за кошт падключэння іншых краін рэгіёна, у прыватнасці Мазамбіка: «У мяне ёсць ідэя, якую мы з Вамі абмяркоўвалі ў свой час. Што мы недзе сустрэнемся ў вас, запросім Прэзідэнта Мазамбіка і разам выбудуем нашы сумесныя адносіны. Зробім так, што ў вас з'явіцца свае партнёры ў Мазамбіку, і мы праз іх будзем з вамі больш эфектыўна і актыўна супрацоўнічаць».

**Паводле прэс-службы Прэзідэнта.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Партыі ў Германіі дамовіліся аб даце датэрміновых выбараў

Кансерватыўны блок Хрысціянска-дэмакратычнага і Хрысціянска-сацыяльнага саюзаў (ХДС/ХСС), Сацыял-дэмакратычная партыя Германіі і «зялёныя» дасягнулі дамоўленасці аб даце правядзення датэрміновых парламенцкіх выбараў, яны адбудуцца 23 лютага. Аб гэтым паведаміла са спасылкай на крыніцы ў ХДС/ХСС газета Handelsblatt, перадае ТАСС. Паводле інфармацыі нямецкага выдання, канцлер Олаф Шольц плануе вынесці на абмеркаванне Бундэстага пытанне аб даверы ўраду, паводле ўдакладненых звестак, 16 снежня, пасля чаго шлях да датэрміновых выбараў будзе адкрыты. Як вядома, Германія перажывае найвастрэйшы палітычны крызіс. Ён узнік у сувязі з рознагалоссямі ў кіруючай кааліцыі па бюджэтнай, фінансавай і эканамічнай палітыцы, пасля чаго яна распалася.

### Мадагаскар мае намер стаць найбуйнейшым вытворцам рысу ў Афрыцы

Пераўтварэнні ў галіне сельскай гаспадаркі Мадагаскара накіраваны на тое, каб краіна стала найбуйнейшым вытворцам рысу ў Афрыцы і адным з лідараў рынку харчавання. Аб гэтым заявіла РІА «Новости» міністр замежных спраў Мадагаскара Расата Рафарававітафіка. «Цяпер мы з'яўляемся трэцім вытворцам рысу ў Афрыцы пасля Нігерыі і Егіпта. Таму адна з нашых асноўных мэт — стаць першым вытворцам рысу ў Афрыцы. Гэта пытанне не толькі выжывання, але і таго, што Мадагаскар калісьці быў жытніцай Індыйскага акіяна», — заявіла кіраўнік МЗС гэтай краіны на палях першай міністэрскай канферэнцыі форуму партнёрства «Расія—Афрыка». Расата Рафарававітафіка дадала, што Мадагаскару важна засяродзіцца на пераўтварэнні сельскагаспадарчага сектара эканомікі для вырашэння пытання харчовага забеспячэння.

### У ЗША цемнаскурыя атрымалі паведамленні з заклікам «адправіцца на плантацыі»

Улады ЗША пачалі расследаванне пасля таго, як некаторыя цемнаскурыя амерыканцы адразу ў некалькіх штатах атрымалі тэкставыя паведамленні расісцкага кшталту: у іх было сказана, што атрымальнікі павінны «адправіцца на плантацыі і збіраць бавоўну». Як адзначыла «Бі-бі-сі», сярод тых, каму яны прыйшлі, былі цемнаскурыя студэнты і школьнікі ў Алабаме, Паўночнай Караліне, Вірджыніі, Нью-Ёрку і Пенсільваніі. Адзначаецца, што амерыканцы пачалі атрымліваць расісцкія паведамленні на наступны дзень пасля прэзідэнцкіх выбараў. У некаторых з іх змяшчаліся адсылкі да перадвыбарнай кампаніі Трампа, аднак прадстаўнікі выбранага прэзідэнта ўжо заявілі, што не маюць да гэтага ніякага дачынення.

26 студзеня 2025
ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## СЯРГЕЙ БОБРЫКАЎ СПЫНЯЕ СВОЙ УДЗЕЛ У ВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ

**Старшыня Рэспубліканскага савета грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз афіцэраў» Сяргей Бобрыкаў прыняў рашэнне спыніць свой удзел у выбарчай кампаніі Прэзідэнта Беларусі. Адпаведную заяву ён зрабіў учора ўвечары.**

— Рашэнне складанае, і давалася яно няпроста, але ёсць важкія аргументы. Я з'яўляюся не толькі членам вышэйшага палітычнага савета беларускай партыі «Белая Русь», якая падтрымала маю кандыдатуру на маючых адбыцца выбарах, але і членам Беларускага саюза афіцэраў, старшынёй Рэспубліканскага савета. І гэтыя абставіны накладваюць найбольшую адказнасць перад тымі людзьмі, якія мяне вылучалі, — падкрэсліў Сяргей Бобрыкаў, дадаўшы, што з моманту рэгістрацыі ініцыятыўнай групы ён атрымаў шмат зваротаў ад афіцэраў.

— Скажу прама, як прынята ў асяроддзі афіцэраў, што гэта былі наступныя словы: «Сёння наша рэспубліка перажывае няпросты час. І каб захаваць краіну, забяспечыць яе стабільнасць, галоўная задача афіцэрскага корпуса Беларусі — з'яднацца вакол нашага Галоўнакамандуючага, падтрымаць дзейнага Прэзідэнта Беларусі на маючых адбыцца выбарах». Каб забяспечыць згуртаванасць афіцэрскага корпуса, не дапусціць ніякіх дваякіх думак сярод ваенных, падтрымаць дзейнага кіраўніка дзяржавы і нашага лідара, я прыняў такое рашэнне, — заявіў Сяргей Бобрыкаў.

**Алена КРАВЕЦ.**

Парламенцкі дзённік

# АКТУАЛЬНЫЯ ЎНУТРАНЫЯ ПЫТАННІ І ПЕРСПЕКТЫЎНЫЯ ЗНЕШНІЯ НАПРАМКІ

## Што разглядаў Савет Палаты прадстаўнікоў на чарговым пасяджэнні

**Парламентарыі падвялі вынікі работы па некаторых актуальных напрамках, акрэслілі новыя мэты і задачы. Як паведаміў Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА, цяпер на разглядзе знаходзяцца 23 законапраекты. Мяркуецца, што на пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў, якое запланавана на 14 лістапада, трэць з іх будзе разгледжана. Па словах спікера, задачы, што стаяць перад профільнымі камісіямі па падрыхтоўцы законапраектаў, у цэлым выкананы.**




Фота БелТА.

«Хацеў бы адзначыць, што вялікая работа праведзена па праекце закона аб змяненні кодэксаў па пытаннях крымінальнай адказнасці. Ва ўсіх абласцях краіны прайшлі дыялогавыя пляцоўкі, узняты шэраг вострых пытанняў. Цяпер Пастаяннай камісіі па заканадаўстве трэба яшчэ раз вывярыць усе пазіцыі, суаднесці прапановы, заўвагі па спрэчных пытаннях. Неабходна акуратна і ўзважана падысці да іх. Тое ж самае датычыцца законапраекта аб рыэлтарскай дзейнасці, які таксама днямі ўнесены ў Палату прадстаўнікоў», — адзначыў Ігар Сергяенка.

**Старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Марына ЛЯНЧЭЎСКАЯ** расказала, што грамадскае абмеркаванне праекта закона «Аб змене кодэксаў па пытаннях крымінальнай адказнасці» было вельмі актыўным. Праект закона дэталёва абмяркоўваўся ў працоўных калектывах. Па яе словах, распрацоўшчыкі дакумента кіраваліся двума галоўнымі прынцыпамі — індывідуальны падыход і справядлівасць. Гэтыя патрабаванні былі агучаны Прэзідэнтам падчас нарады па асобных пытаннях удасканалення заканадаўства аб крымінальнай адказнасці ў студзені гэтага года. «У грамадстве ёсць разуменне таго, што закон накіраваны на збалансаванне норм крымінальнага права і дае магчымасць судам больш дыферэнцыравана падыходзіць да прызначэння пакаранняў», — падкрэсліла Марына Лянчэўская.

Савет Палаты прадстаўнікоў абмеркаваў таксама падрыхтоўку да парламенцкіх слуханняў на тэму «Развіццё лічбавага права ў Рэспубліцы Беларусь». Іх правядзенне запланавана на 22 лістапада 2024 года. Як паведаміў **старшыня Пастаяннай камісіі па прамысловасці, энергетыцы, транспарце, сувязі і лічбавым развіцці Юрый ПАНФІЛАЎ**, на парламенцкія слуханні запрошаны 38 дзяржаўных органаў і арганізацый. Па яго словах, пытанне лічбавага права ў нашай краіне вельмі актуальнае і своечасовае. «Інфармацыйныя тэхналогіі, IT-сфера актыўна развіваюцца. Лічбавасць грамадства — усеабсковая. І, безумоўна, інфармацыйныя тэхналогіі патрабуюць заканадаўчага рэгулявання. Лічбавыя тэхналогіі дазваляюць нам паскорыць працэс зносін і атрымання адміністрацыйных працэдур, нейкіх паслуг, але ў той жа час нясуць новыя выклікі, рызыкі. Таму на парламенцкіх слуханнях 22 лістапада ў Авальнай зале мы будзем разглядаць пытанні вузкіх месцаў у лічбавым праве, рэгулявання лічбавых адносін, далягляды развіцця, — адзначыў Юрый Панфілаў. — На месцы стаяць нельга, таму што тэхналогіі ідуць наперад і патрабуюць сур'ёзнага рэгулявання».

Савет Палаты прадстаўнікоў не пакінуў без увагі і пытанні міжнароднага супрацоўніцтва. Ігар Сергяенка падвёў вынікі некаторых замежных камандзіровак. У прыватнасці, гаворка ішла пра міжпарламенцкія сувязі з краінамі далёкай дугі. У кастрычніку беларуская дэлегацыя здзейсніла афіцыйны візіт у Лаоскую Народна-Дэмакратычную Рэспубліку. «Мы прынялі ўдзел у 45-й Генеральнай асамблеі Міжпарламенцкай асамблеі Асацыяцыі дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі на тэму «Роля парламентаў ва ўмацаванні ўзаемасувязі і інклюзіўным росце». Падчас афіцыйнага візіту праведзены сустрэчы з кіраўнікамі Лаоскай Народна-Дэмакратычнай Рэспублікі, падпісаны мемарандум аб супрацоўніцтве паміж парламентамі Беларусі і Лаоса. Абмеркаваны шэраг пытанняў, якія датычацца развіцця двухбаковых адносін, у тым ліку гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі. На палях гэтых мерапрыемстваў прайшлі сустрэчы са старшынёй Нацыянальнага сходу Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам, генеральным сакратаром МПА АСЕАН», — расказаў Ігар Сергяенка. У аўторак у рэжыме відэаканферэнцыі прайшла сустрэча рабочых груп па супрацоўніцтве парламентаў Беларусі і В'етнама, на якой абмяркоўваліся пытанні ўзаемадзеяння і садзейнічання ў рэалізацыі дамоўленасцяў, дасягнутых на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў і парламентаў. «У тым ліку гэта датычыцца паскарэння ўступлення ў сілу пагаднення паміж урадам Рэспублікі Беларусь і ўрадам Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам аб адмене віз для ўладальнікаў нацыянальных пашпартоў», — удакладніў Старшыня Палаты прадстаўнікоў.

Ігар Сергяенка таксама звярнуў увагу, што днямі беларуская парламенцкая дэлегацыя вярнулася з Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі. Па яго словах, гэты візіт быў вельмі прадукцыйны і фактычна азнаменаваў пачатак актывізацыі супрацоўніцтва з Панафрыканскім парламентам. Падпісаны мемарандум аб супрацоўніцтве паміж Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь і Панафрыканскім парламентам.

**Старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Сяргей РАЧКОЎ** падрабязна спыніўся на супрацоўніцтве з Пакістанам. На пасяджэнні Савета Палаты прадстаўнікоў было разгледжана гэтае пытанне ў кантэксце рэалізацыі дамоўленасцяў па выніках візіту спікера парламента Пакістана ў Беларусь. «З Пакістанам у нас склаліся вельмі канструктыўныя, даверлівыя адносіны. Гэта пацвердзіў і візіт спікера ў нашу краіну. За гэты перыяд мы прааналізавалі, як працуе дагаворна-прававая база нашага супрацоўніцтва, а ў нас дзейнічае каля 90 міжнародных дагавораў. Вядома, мы засяроджваемся на садзейнічанні рабоце ўрада ў гандлёва-эканамічнай сферы з акцэнтам на прамысловую кааперацыю, узаемадзеянне ў сельскай гаспадарцы», — адзначыў Сяргей Рачкоў. Ён зрабіў акцэнт на тым, што апошнім часам гандлёва-эканамічныя адносіны паміж краінамі развіваюцца вельмі дынамічна. «У нас добрыя перспектывы, ёсць зацікаўленасць пакістанскага боку. Створаны групы дружбы паміж парламентамі. Мы падключыліся таксама да работы міжурадавай камісіі і розных тэматычных рабочых груп, якія створаны ў рамках гэтай камісіі», — рэзюмаваў Сяргей Рачкоў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

Грамадства

# Гістарычная памяць — своеасаблівае поле бою

## Аб гэтым гаварылі ў Нацыянальнай бібліятэцы

**«Гібрыдныя войны, якія сёння вядуцца супраць нацыянальных гісторый, патрабуюць максімальнай кансалідацыі дзяржавы і грамадства», — адзначыў у адным з выступленняў дырэктар Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь Андрэй ДЗЕМЯНЮК. Сапраўды, вытрымаць інфармацыйны прэсінг Захада, нападкі на гістарычную праўду можна толькі сумеснымі намаганнямі. Яскравым прыкладам такога адзінства з'яўляецца Рэспубліканскі форум «Памяць пакаленняў у імя будучыні», прымеркаваны да святкавання 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, які адбыўся ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.**

Пачатак маштабнаму мерапрыемству паклала прэзентацыя выставы «Вялікая Айчынная вайна: гісторыя краіны — мая гісторыя». Экспанаты — найлепшыя творчыя праекты розных адукацыйных і дзяржаўных устаноў, грамадскіх аб'яднанняў, якія ўзялі ўдзел ва Усебеларускім патрыятычным праекце «Памяць пакаленняў у імя будучыні».

— Мы прадстаўляем Кнігу памяці контр-адмірала Чарнаморскага флоту Пятра Бандарэнкі, славутага продка вучаніцы VIII класа ваенна-патрыятычнага кірунку Лізаветы Бальшаковай. Яна і з'яўляецца ініцыятарам праекта. У якасці асноўных крыніц выкарысталі ўспаміны сваякоў героя (дзеда і дзядзькі Лізы), фотаздымкі з сямейнага архіва і навуковыя работы Барыса Даўгатовіча, кандыдата гістарычных навук, які даследаваў дзейнасць розных военачальнікаў Беларусі, у тым ліку і Пятра Ціханавіча, — расказала **педагог-арганізатар сярэдняй школы № 93 Мінска Ксенія САКАЛОЎСКАЯ.**

Дарэчы, каб атрымаць ілюстрацыйны матэрыял і ўспаміны, Ліза разам з маці і малодшай сястрычкай ездзіла ў вёску Карму — на малую радзіму свайго прадзеда. Там у яго гонар калісьці арганізавалі невялікі музей, аднак многія дакументы, на жаль, былі знішчаны пажарам.

— Захоўваць памяць аб тых часах важна і каб не дапусціць паўтарэння гісторыі, і для выхавання ў нашай моладзі гонару, адказнасці і ўдзячнасці за тое, што мы жывём і працуем пад мірным небам Беларусі, — дадала педагог.



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Шэраг гісторый аб савецкіх воінах прэзентавалі прадстаўнікі гімназіі № 2 г. Віцебска. Навучэнцы правялі вялікую работу: кожны сабраў інфармацыю пра сваіх сваякоў-удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны і адлюстраваў яе ў цікавых лэпбуках (кніжках-раскладанках, на старонках якіх размешчаны не проста малюнкі і тэкст, але і кішэні, акенцы, карткі, рухомыя элементы і ўстаўкі).

— Дзеці даведаліся шмат новага пра свае сем'і. У Леаніда Яфрэменкі, напрыклад, прадзед, каб тэрмінова даставіць важны прыказ, некалькі кіламетраў поўз па-пластунску. У Андрэя Косціна прадзед не толькі змагаўся з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, але і працаваў пасля вайны дырэктарам Мішкаўскай і Бабінічскай школ, выхоўваючы ў сваіх вучняў патрыятызм. На базе адной з іх быў складзены цэлы мемарыял, створана Алея памяці з 132 яблынь, — паведаміла **педагог-арганізатар Таццяна ВЯРХОЎСКАЯ.**

Усяго было складзена каля 40 лэпбукаў, тры найлепшых трапілі на рэспубліканскі этап. Астатнія леглі ў аснову відэапраекта ў «Інстаграме» гімназіі, прымеркаванага да 80-годдзя Вялікай Перамогі: адзін раз на два тыдні, да 9 Мая, пра кожную з работ будзе выходзіць відэаролік.

Падчас цырымоніі адкрыцця адбылося ўзнагароджанне ўстаноў адукацыі, якія ўнеслі важкі ўклад у захаванне гістарычнай памяці аб Вялікай Айчыннай вайне і значныя дасягненні ў пошукавай рабоце з дзецьмі і моладдзю.

Фотаздымкі і кнігі, медалі і франтавыя лісты, асабістыя рэчы савецкіх воінаў і інтэрактыўныя праекты... Вялікая сумесная работа ўстаноў адукацыі, Нацыянальнага архіва Беларусі, Нацыянальная бібліятэкі Беларусі, дзяржаўных органаў, грамадскіх аб'яднанняў, актывістаў пошукавай работы і неабыякавых да гістарычнай памяці грамадзян.

— Тэма нашага форуму актуальная і важная для кожнага, хто сёння жыве, вучыцца, працуе на мірнай беларускай зямлі. Калісьці нашы дзяды і прадзеды вызвалілі гэту зямлю ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, цаной уласнага жыцця атрымалі перамогу, — адзначыла падчас цырымоніі адкрыцця форуму **намеснік міністра адукацыі Кацярына ПЯТРУЦКАЯ.** — Сёння практычна ва ўсіх установах Беларусі створаны музеі і музейныя экспазіцыі, прысвечаныя генацыду беларускага народа і героям, якія загінулі ў баях у час Вялікай Айчыннай вайны. Дзякуючы рабоце навучэнцаў і педагогаў гэта свяшчэнная для нас памяць захоўваецца. Пераемнікі пакалення пераможцаў, сёння ў вашых руках будучыня нашай краіны!

Усяго ў мерапрыемстве ўзялі ўдзел звыш 400 навучэнцаў і педагогаў з усіх рэгіёнаў краіны.

— Гістарычная памяць — своеасаблівае поле бою, на якім мы з вамі прайграць не маем права. Кожны з прысутных з'яўляецца салдатам на гэтым полі: захоўваючы гістарычную памяць, памяць аб сваіх родных і блізкіх, тых, хто здабываў і каваў цяжкую перамогу, — падкрэсліў **памочнік міністра абароны па ідэалагічнай рабоце ва Узброеных Сілах — начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы генерал-маёр Леанід КАСІНСКІ** і дадаў, што цяпер на Захадзе скажаюць гістарычныя факты, знішчаюць магілы савецкіх салдатаў-вызваленцаў Еўропы.

— Яны баяцца нашых воінаў, нават увасобленых у помніках і манументах, баяцца гістарычнай праўды. А мы з вамі яе захоўваем і зробім усё, каб перадаць яе будучым пакаленням, — рэзюмаваў ён. — З такой таленавітай і патрыятычнай моладдзю Беларусь чакае толькі вялікая і светлая будучыня.

**Александрына ПАРШЫНА.**

# У ІНТАРЭСАХ ЛЮДЗЕЙ



(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## АСНОЎНЫ КІРУНАК

Зараз кожны дакумент, які датычыцца сацыяльна-эканамічных пытанняў працоўных, у абавязковым парадку накіроўваецца ў ФПБ на ўзгадненне. Больш за тое, нярэдкія выпадкі, калі ФПБ і яе членскія арганізацыі выходзяць з самастойнай ініцыятывай па ўнясенні тых ці іншых змяненняў у дзейнае заканадаўства.

Яшчэ адзін кірунак у пытаннях сацыяльна-эканамічнай абароны працоўных — гэта грамадскі кантроль за захаваннем заканадаўства аб працы. На пастаяннай аснове прафсаюзы праводзяць праверкі і маніторынгі па гэтых пытаннях.

— У полі зроку прафсаюзаў найважнейшыя пытанні, якія хвалююць нашых працоўных. Гэта і паўната і своечасовасць выплаты заработнай платы і іншых выплат, захаванне ўсіх прадугледжаных працоўных гарантый, законнасць афармлення працоўных адносін, — звярнула ўвагу Таццяна Філімонава.

У выпадку выяўлення тых ці іншых парушэнняў прафсаюзы ў абавязковым парадку выдаюць наймальнікам рэкамендацыі і прадстаўленні, і ўсе яны выконваюцца. Прававую дапамогу прафсаюзы прадастаўляюць у розных формах. Гэта кансультаванне работнікаў па працоўных пытаннях, дапамога ў вырашэнні працоўных спрэчак, абарона інтарэсаў працоўных у судзе.

Толькі за шэсць месяцаў бягучага года прафсаюзныя юрысты выявілі больш за дзевяць тысяч выпадкаў парушэнняў працоўнага заканадаўства ў адносінах да працоўных. Грамадзяне атрымалі звыш 25 тысяч кансультацый. Дзякуючы ўмяшальніцтву прафсаюзаў працоўным было вернута больш як тры мільёны рублёў — нявыплачаных ці незаконна ўтрыманых.

Акрамя таго, за паўгода было падрыхтавана звыш 260 працэсуальных дакументаў, а суды разгледзелі 55 іскавых дакументаў, складзеных юрыстамі прафсаюза. З пачатку года 11 чалавек былі адноўлены на рабоце.

Акрамя захавання заканадаўства аб працы, у полі зроку прафсаюза знаходзяцца і пытанні аховы працы. Тэхнічная інспекцыя за восем месяцаў бягучага года правяла больш за 5,5 тысячы праверак і маніторынгаў, падчас якіх было выяўлена звыш 35 тысяч парушэнняў. Інспекцыя таксама выдае рэкамендацыі і даведкі, якія з'яўляюцца абавязковымі для выканання наймальнікамі.

Сёлета ўпершыню на перыяд уборачнай кампаніі ФПБ запусціла «гарачую лінію», на якую можна было паведаміць свае пажаданні і заўвагі па правядзенні ўборачнай кампаніі.

— Варта адзначыць, што дзякуючы рабоце «гарачай лініі» шэраг пытанняў, якія ставіліся нашымі аграрыямі, вырашаліся калі не ў той жа, то на наступны дзень. Практыка правядзення «гарачых ліній» будзе працягнута, бо яна паказала сур'ёзныя вынікі і эфектыўнасць, — падзялілася Таццяна Філімонава.

## ПЕНСІІ І БАЛЬНІЧНЫЯ

Што датычыцца заканатворчай дзейнасці, прафсаюз ініцыяваў шэраг змяненняў, якія былі ўнесены ў заканадаўства. Так у Працоўны кодэкс унесены нормы, накіраваныя на падаўжэнне тэрміну кантракту з добрасумленнымі работнікамі, прадугледжана магчымасць аплаты сацыяльных водпускаў работнікаў. Акрамя таго, вырашана пытанне аб уключэнні ў поўным аб'ёме ў страхавы стаж і ўліку пры налічэнні пенсіі перыядаў догляду за дзецьмі ва ўзросце да трох гадоў для маці, якія маюць чатырох дзяцей.

— Раней такім мамам улічвалі толькі 9 гадоў, сёння — 12. Нонсэнс у тым, што маці мае чацвярых дзяцей, чатыры разы была ў адпачынку па доглядзе за дзіцем да трох гадоў, але ў страхавы стаж улічвалася толькі дзевяць гадоў. Дзякуючы ўмяшальніцтву прафсаюзаў гэтая несправядлівасць была выпраўлена, — прывяла прыклад Таццяна Філімонава.

Па ініцыятыве прафсаюзаў вырашана і пытанне знаходжання дома хворага работніка без бальнічнага ліста цягам да трох дзён. У 2020 годзе, калі наша краіна сутыкнулася з пандэміяй COVID-19, прафсаюзы выступілі з такой ініцыятывай. Дзяржава прапанову падтрымала, і цяпер гэтыя нормы прадугледжаны ў заканадаўчых актах.

ФПБ неаднойчы выходзіла з пытаннем па ўдасканаленні пенсійнай сістэмы. Намеснік старшыні ФПБ нагадала, што ў канцы кастрычніка кіраўніком дзяржавы быў падпісаны Указ № 402 «Аб сацыяльнай падтрымцы», згодна з якім з 1 студзеня 2025 года пенсіянеры, якія працягваюць працаваць, у поўным памеры будуць атрымліваць пенсію.

— Гэта важнае пытанне, якое пасадзейнічае таму, што высокакваліфікаваныя асобы пенсіённага ўзросту будуць працягваць сваю працоўную дзейнасць. У тым ліку гэта будзе садзейнічаць і развіццю настаўніцтва. Не сакрэт, што ёсць шэраг прафесій, якія ў абавязковым парадку патрабуюць наяўнасці настаўніка. Атрымаць дыплом, закончыўшы навучальную ўстанову, недастаткова для таго, каб стаць прафесіяналам. Вельмі важна, каб побач быў вопытны калега, які дапаможа маладому спецыялісту ўвайсці ў курс справы і напрацоўваць свой досвед, — пракаментавала Таццяна Філімонава.

Сярод пытанняў ёсць адно, якое доўга прапрацоўвалася прафсаюзамі, — тэрмін для разліку сярэдняга заробку пры аплаце бальнічных лістоў. Менавіта прафсаюзы настаялі на тым, каб у разлік сярэдняга заробку для налічэння бальнічных бралася не 24, а 18 месяцаў. Акрамя таго, прафсаюзы выйшлі з ініцыятывай (і яна была падтрымана ўрадам) выплаты бальнічных маладым людзям, якія працаўладкаваліся без накіравання навучальнай установы і не маюць статусу маладога спецыяліста ці маладога рабочага. Дзякуючы гэтаму бальнічныя выплаты для такой катэгорыі моладзі павялічыліся амаль у тры разы.

## ЗАРПЛАТЫ, ВОДПУСКІ

Ажыццяўляюць прафсаюзы і маніторынг за несвоечасовасцю выплаты заработнай платы.

— На жаль, з пачатку бягучага года было выяўлена каля 160 выпадкаў несвоечасовай выплаты заработнай платы. Прафсаюзы ў выпадку выяўлення такіх фактаў неадкладна выдаюць рэкамендацыю наймальніку з просьбай устараніць парушэнне. Калі наймальнік не рэагуе, за намі (прафсаюзамі) застаецца права звароту ў пракуратуру, і не адзінкавыя выпадкі, калі мы з яе дапамогай вырашалі пытанне, — адзначыла намеснік старшыні ФПБ.

Нярэдкія і выпадкі парушэння працоўнага заканадаўства ў частцы прадастаўлення працоўных водпускаў, накіравання ў камандзіроўку, прычым як па Беларусі, так і за межы краіны, афармлення сацыяльных водпускаў. А вось на першым месцы па колькасці парушэнняў заканадаўства аб працы — афармленне працоўных адносін, калі ў працоўны дагавор не ўнесены ўсе нормы ці ўнесены з парушэннем заканадаўства.

Сёння да прафсаюзных юрыстаў часта звяртаюцца людзі, якія не хочуць працягваць працоўныя адносіны з наймальнікам, але той супраць. Нават у выпадках, калі работнікі мяняюць месца жыхарства, наймальнікі ўсё роўна адмаўляюцца іх звальняць.

— Быў выпадак, ён датычыўся сферы прафесійнага спорту, калі работнік пераехаў у Расію, прадаставіў усе пацвярджальныя дакументы, але наймальнік катэгарычна адмаўляўся яго звальняць. Нам удалося пераканаць наймальніка, растлумачыўшы нормы заканадаўства, што ёсць вялікая верагоднасць выйграць суд, і работнік быў звольнены ў сувязі са змяненнем месца жыхарства, — прывяла прыклад Таццяна Філімонава, дадаўшы, што апошнім часам колькасць зваротаў работнікаў у суд змяншаецца, бо з дапамогай прафсаюзаў удаецца вырашаць шэраг пытанняў у дасудовым парадку.

Нярэдкія звароты па пытаннях дысцыплінарных спагнанняў, калі работнік лічыць, што ў дачыненні да яго незаконна прыменена тая ці іншая мера. Не заўсёды прафсаюзам удаецца адстаяць работніка, і не заўсёды работнік звяртаецца, калі ў дачыненні да яго незаконна прыменена дысцыплінарнае спагнанне.

— Часам калі работнік правініўся, як у апошнюю інстанцыю ён звяртаецца ў прафсаюз і спадзяецца, што мы зможам яго адстаяць. Заўважу, што мы не можам адстаяць чалавека, які не хадзіў на работу, не выконваў свае функцыянальныя і службовыя абавязкі. Так, калі ў адносінах да работніка парушана заканадаўства і незаконна прыменена тое ці іншае дысцыплінарнае спагнанне, мы дапаможам, — звярнула ўвагу Таццяна Філімонава.

Калі яшчэ пяць гадоў таму асноўнай катэгорыяй работнікаў, якія звярталіся ў прафсаюзы, былі людзі перадпенсіённага ўзросту ці з 10-15 гадамі стажу, то сёння дастаткова актыўна звяртаюцца і маладыя людзі. Справа ў тым, што прафсаюзы актыўна працуюць са студэнтамі і навучэнцамі. У прыватнасці, праводзяць сустрэчы перад размеркаваннем, падчас якіх расказваюць, на што маладыя спецыялісты могуць прэтэндаваць на сваім першым працоўным месцы.

— І калі малады спецыяліст прыходзіць на сваё першае месца работы, ён разумее, што можа звярнуцца ў прафсаюз. Не заўсёды ён разумее, парушана заканадаўства ці не, але, у любым выпадку, ён можа патэлефанаваць і пракансультавацца. Нашы кантакты ў доступе на прафсаюзных стэндах, на сайтах і ў сацыяльных сетках. Радуе, што часта звяртаюцца без факта парушэння працоўнага заканадаўства, а з мэтай удакладніць, ці правільна ў адносінах да працаўніка прыменена дысцыплінарнае ўзысканне, — дадала Таццяна Філімонава.

## ДЗЕЙСНЫ «НАРОДНЫ КАНТРОЛЬ»

Цягам некалькіх апошніх гадоў ФПБ праводзіла штомесячны кантроль за цэнамі, асартыментам прадуктаў у аб'ектах гандлю. Спецыялісты выходзілі ў гандлёвыя сеткі і маніторылі ўзровень цэн, якасць прадуктаў. З ліпеня бягучага года такая форма была зменена і перарасла ў грамадскія прыёмныя. Праз сайт ФПБ цяпер можа звярнуцца любы ахвотны з пытаннем, прапановай, пажаданнем, якія датычацца пытанняў спажывецкага рынку.

Грамадзяне актыўна карыстаюцца грамадскімі прыёмнымі — тэлефануюць ці пішуць анлайн свае заўвагі на асартымент, якасць, пратэрмінаваныя прадукты. Абсалютна ўсе звароты прафсаюзы разглядаюць, праўда, не ўсе з іх пацвярджаюцца. Пры неабходнасці спецыялісты выязджаюць ва ўказаныя гандлёвыя сеткі. Калі факты пацвярджаюцца, прафсаюз інфармуе адпаведныя дзяржаўныя органы.

За час работы грамадскіх прыёмных паступіла больш за 35 зваротаў, усе былі разгледжаны.

— Такая форма грамадскага кантролю эфектыўная, таму што і гандлёвыя сеткі разумеюць, што любы ахвотны можа звярнуцца і паведаміць пра тое ці іншае парушэнне. Нярэдка людзі паведамляюць пра пратэрмінаваныя тавары. Ёсць выпадкі, калі вельмі бедны асартымент у той ці іншай гандлёвай сетцы. Такая форма «народнага кантролю» дае свае добрыя вынікі, — рэзюмавала Таццяна Філімонава.

**Алена КРАВЕЦ.**

Важна

# ПАВЫСІЦЦА САЦЫЯЛЬНАЯ АБАРОНЕНАСЦЬ ВЕТЭРАНАЎ І ПАЦЯРПЕЛЫХ АД ВОЙНАЎ АСОБ

**Прэзідэнт падпісаў Закон Рэспублікі Беларусь «Аб змяненні законаў па пытаннях ветэранаў». Дакумент прыняты ў мэтах павышэння сацыяльнай абароненасці ветэранаў і пацярпелых ад войнаў асоб. Ён прадугледжвае ўзмацненне сацыяльных гарантый ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, былым вязням фашызму, ветэранам баявых дзеянняў на тэрыторыях іншых дзяржаў, удовам загінулых ваеннаслужачых, якія не ўзялі новы шлюб, а таксама вольнанаёмным асобам, якія накіроўваліся для работы ў Афганістан.**

У прыватнасці, ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаным ордэнамі або медалямі СССР за бездакорную воінскую службу ў тыле (прыраўноўваюцца да ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны), прадугледжана павелічэнне памеру штомесячнага павышэння да пенсіі з 50 % да 250 % мінімальнай пенсіі, павелічэнне штогадовай дапамогі да Дня Перамогі, матэрыяльная дапамога на аздараўленне пры немагчымасці яго праходжання ў санаторыі.

Ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, узнагароджаным ордэнамі або медалямі СССР за самаадданую працу ў тыле, прадугледжана павелічэнне штомесячнага памеру павышэння да пенсіі з 50 % да 100 % мінімальнай пенсіі па ўзросце, пазачарговае абслугоўванне ў арганізацыях аховы здароўя, пазачарговая шпіталізацыя, а таксама першачарговы прыём у дзяржаўных органах і іншых арганізацыях незалежна ад формы ўласнасці.

Былым вязням фашызму прадугледжаны бясплатна: забеспячэнне лекамі і тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі, санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне, выраб і рамонт зубных пратэзаў.

Ветэранам баявых дзеянняў на тэрыторыях іншых дзяржаў устаноўлена зніжэнне пенсіённага ўзросту на пяць гадоў (для асоб, якія атрымалі статус інваліда ў мірны час), бясплатнае забеспячэнне лекамі, тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі, санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне, выраб і рамонт зубных пратэзаў.

Удовам загінулых ваеннаслужачых, якія не ўзялі новы шлюб, будуць прадастаўлены медыцынскія льготы (нароўні з бацькамі загінулых ваеннаслужачых): бясплатнае забеспячэнне лекамі, санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне.

Акрамя таго, вольнанаёмным асобам, якія накіроўваліся для работы ў Афганістан у перыяд 1979—1989 гадоў, прадугледжана павышэнне да пенсіі ў памеры 100 % мінімальнай пенсіі па ўзросце.

Закон уступае ў дзеянне з 1 мая 2025 года.

# АДЗІНЫ МАЁМАСНЫ ПЛАЦЕЖ




*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аплаціць маёмасныя падаткі можна праз сэрвіс «Асабісты кабінет плацельшчыка» на сайце МПЗ, а таксама з дапамогай сістэмы АРІП. У АРІП прадугледжаны наступны алгарытм: сістэма «Разлік» (АРІП) — падаткі — вобласць/горад/раён — ІМПЗ па раёне (або ўпраўленне па рабоце з плацельшчыкамі па раёне) па месцы рэгістрацыі фізічнай асобы. Для аплаты падатку трэба выбраць «адзіны маёмасны плацеж» і ўліковы нумар плацельшчыка (УНП). УНП ўводзіцца загалоўнымі літарамі лацінскага алфавіту без прабелаў.

Уліковы нумар плацельшчыка паказаны ў паведамленні падатковага органа. Аплаціць адзіны маёмасны плацеж можна і ў аддзяленнях банкаў, паштовай сувязі — наяўнымі альбо з выкарыстаннем банкаўскай карткі.

## Памер мае значэнне

У свой час падатковыя органы самастойна атрымліваюць інфармацыю аб аб'ектах падаткаабкладання, аб правах плацельшчыка на розныя падатковыя льготы і вырабляюць разлік падаткаў. Потым, з 1 жніўня, пачынаюць накіроўваць паведамленні на аплату фізічнымі асобамі маёмасных падаткаў. У адпаведнасці з заканадаўствам дадзеныя паведамленні накіроўваюцца плацельшчыкам да 1 кастрычніка.

Тыя грамадзяне, у якіх ёсць асабісты кабінет плацельшчыка і якія пагадзіліся на атрыманне паведамленняў электронным спосабам, дадаткова да папяровай версіі атрымалі яшчэ электроннае паведамленне.

У паведамленні зводзяцца ўсе аб'екты падаткаабкладання маёмаснымі падаткамі, якія належаць плацельшчыку і якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі. Гэта можа быць кватэра ў Мінску, дача ў Мінскім раёне, атрыманы ў спадчыну жылы дом у іншым раёне, транспартны сродак. Адно паведамленне змяшчае ў сабе ўсё, што вельмі зручна. Не трэба, як некалькі гадоў таму, атрымліваць некалькі паведамленняў ад розных раённых інспекцый. Плацельшчык адразу ўбачыць усе аб'екты падаткаабкладання, разлік падатку па кожным з іх і агульную суму падатку. У паведамленні дадаткова размяшчаецца код хуткага плацяжу для сістэмы АРІП, а таксама QR-коды для аплаты.

У выпадку калі чалавек страціў паведамленне, яму дастаткова ведаць уліковы нумар плацельшчыка. Па ім можна ўдакладніць, якая сума падлягае выплаце. Уліковы нумар можна знайсці з дапамогай сэрвісу «Звесткі з дзяржаўнага рэестра плацельшчыкаў» на сайце падатковых органаў Беларусі.

А ў асабістым кабінеце плацельшчыка можна пераформіраваць паведамленне і працаваць з ім у электронным выглядзе. «Дарэчы, асабісты кабінет можна адкрыць дыстанцыйна (з выкарыстаннем міжбанкаўскай сістэмы ідэнтыфікацыі альбо звестак мабільнага аператара). «Ужо няма неабходнасці наведваць падатковы орган, хоць такі спосаб таксама застаўся», — дадаў Андрэй Кавалеўскі.

Падатак на нерухомасць аплачвае самая масавая катэгорыя людзей — тыя, у каго ёсць кватэра, жылы дом, дача, садовы домік, гараж, машына-месца. Зямельны падатак аплачваюць уладальнікі зямельных участкаў. Плацельшчыкам трэба ўлічыць важны нюанс. Раней падатак на нерухомасць і зямельны падатак аплачваліся на працягу года за бягучы год. Затым было прынята рашэнне, што гэтыя падаткі будуць аплачвацца пасля завяршэння года. 2022 год стаў пераходным перыядам. Грамадзяне ў 2022-м заплацілі авансавы плацеж у памеры 50 % ад сумы. А да лістапада 2023 года яны зрабілі канчатковую даплату да гадавой сумы. Цяпер падатак будзе аплачвацца за папярэдні год: у 2024 годзе за 2023-ы. Так і ў наступныя гады.

«Так што сёлета мы аплачваем паўнавартасную суму. Каб не было ніякіх сумненняў — гэта не двухразовае павелічэнне сумы падатку, гэта менавіта паўнавартасная аплата за ўвесь год. Таму ніхто не павінна бянтэжыць, што сумы змяніліся», — звярнуў увагу прадстаўнік МПЗ.

## Хто мае правы на льготы?

Ёсць шэраг ільгот па падатку на нерухомасць і зямельным падатку. Прычым плацельшчыкам не трэба падаваць інфармацыю — падатковыя органы самі збіраюць гэтыя даныя і даюць ільготы пры разліку падаткаў. Толькі калі нейкая льгота не была выдзелена, тады трэба звязацца з падатковай, усё ўдакладніць і падаць дакументы, калі трэба.

З 2022 года адменена льгота ў дачыненні да адной кватэры, таму ўсе, хто валодае нават адной кватэрай, плацяць падатак на нерухомасць. Аднак ільгота захавана для сацыяльна неабароненых катэгорый насельніцтва. Гэта асобы, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту альбо ўзросту, які дае права на больш раннюю пенсію, а таксама інваліды I і II груп, непаўналетнія дзеці, вайскоўцы тэрміновай і альтэрнатыўнай службы.

«Гэтыя катэгорыі вызваляюцца ад падатку ў дачыненні да адной кватэры, а таксама аднаго жылога дома. Таму калі, напрыклад, у пенсіянера ва ўласнасці маецца адна кватэра і адзін жылы дом, тады ён не плаціць падатак на нерухомасць ні па адным, ні па другім аб'екце. Толькі калі ў пенсіянера будзе, напрыклад, дзве кватэры, два дамы, то ён аплачвае падатак толькі за другую кватэру або за другі дом», — удакладніў Андрэй Кавалеўскі.

Члены шматдзетнай сям'і (у якой на выхаванні знаходзяцца не менш як трое дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў) вызвалены цалкам ад падаткаў на любую колькасць кватэр і жылых дамоў. Акрамя таго, і пенсіянеры, і члены шматдзетнай сям'і, іншыя льготныя катэгорыі вызвалены ад выплаты падатку ў дачыненні да любой колькасці прыналежных ім садовых домікаў, дач, гаражоў, машына-месцаў.

Прадугледжаны і іншыя льготы, напрыклад, у дачыненні да нерухомасці, размешчанай у сельскай мясцовасці, што належыць асобам, якія пражываюць на вёсцы, працуюць там ва ўстановах адукацыі, ахovы здароўя, культуры. Нягледзячы на тое, што ёсць закрыты пералік ільгот, любая фізічная асоба заўсёды мае права звярнуцца ў мясцовы Савет дэпутатаў альбо ў мясцовы выканаўчы камітэт для атрымання дадатковых падатковых ільгот у выпадку, калі знаходзіцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Гэта таксама прапісана ў Падатковым кодэксе. Цяжкая жыццёвая сітуацыя — сітуацыя, якую фізічная асоба не можа пераадолець з прычыны сваіх магчымасцяў (не толькі ўзровень матэрыяльнага забеспячэння, а розныя абставіны). Так што, калі чалавек не льготнік, але абставіны не дазваляюць яму аплаціць падаткі, ён заўсёды можа звярнуцца ў мясцовыя органы ўлады, дзе разгледзяць пытанне аб вызваленні ад аплаты.

У зямельных падаткаў такі ж прынцып, як і ў падаткаў на нерухомасць, распавёў прадстаўнік Міністэрства па падатках і зборах. Ільготы па зямельным падатку даюцца на ўчасткі, выдзеленыя для будаўніцтва і абслугоўвання жылога дома альбо садаводства, касьбы.

У транспартнага падатку трохі іншы прынцып атрымання льгот і яго збірання. Аб'ект гэтага падатку — транспартны сродак, зарэгістраваны за фізічнымі асобамі ў ДАІ, — удакладніў Андрэй Кавалеўскі. Незалежна ад узросту, катэгорыі плацельшчыка не абкладаюцца транспартным падаткам аўтамабілі, выпушчаныя да 1992 года, а таксама легкавыя электрамабілі (такая льгота дзейнічае да канца 2025 года). Для асоб, якія дасягнулі агульнаўстаноўленага пенсіённага ўзросту, інвалідаў I, II груп, шматдзетных сем'яў, ільгота даецца ў выглядзе зніжэння стаўкі транспартнага падатку на 50 працэнтаў.

## Павышаны транспартны падатак

Андрэй Кавалеўскі нагадаў, што транспартны падатак вылічваецца па павялічаных у 10 разоў стаўках па транспартных сродках прэміяльнага класа, з года выпуску якіх прайшло не больш за тры гады.

Гаворка ідзе аб пераліку аўто павышанай камфортнасці, які вызначаецца ўрадам. У пастанову Савета Міністраў, якая прынята ў сакавіку гэтага года, уключаны ўвесь мадэльны шэраг Aston Martin, Aurus, Bentley, Bugatti, Ferrari, Lamborghini, Maserati, McLaren, Porsche, Rolls-Royce, некаторыя мадэлі Audi, BMW, Cadillac, Land Rover, Lexus, Mercedes-Benz, Toyota.

«Павышаны транспартны падатак уведзены ў 2024 годзе. Але паколькі грамадзяне, у адрозненне ад арганізацый, плацяць падаткі пасля завяршэння года, то падаткаабкладанне павышаным транспартным падаткам будзе працаваць упершыню толькі ў 2025 годзе», — растлумачыў Андрэй Кавалеўскі. Паводле разлікаў МПЗ, гэтая норма закране крыху больш за 1 тысячу аўтаўладальнікаў.

У цяперашні час разглядаецца ўнясенне змяненняў у заканадаўства. Мяркуецца паказваць не толькі маркі і мадэлі транспартных сродкаў, але і колькасць гадоў з моманту выпуску аўто. «Сёння крытэрый — тры гады. Але плануецца, калі нормы будуць адобраны і прыняты, будзе больш вялікая градацыя, паколькі мы разумеем, што пэўны прэміяльны клас з часам толькі даражэе, а не таннее», — сказаў Андрэй Кавалеўскі. Ён дадаў, што гэтыя карэкціроўкі закрануць транспартны падатак за 2025 год, які неабходна аплаціць у 2026-м.

## Змяненні будуць нязначныя

Блок бюджэтных дакументаў, у тым ліку законапраект «Аб змяненні законаў», які прадугледжвае карэкціроўку Падатковага кодэкса, разгледжаны 31 кастрычніка на пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў. Андрэй Кавалеўскі растлумачыў, што змены ў Падатковы кодэкс уносяцца штогод. У частцы маёмасных падаткаў яны ў асноўным датычацца паэтапнай індэксацыі ставак, ільгот, вылікаў.

«Значных, вялікіх змен не ўносіцца, таму што падатковая сістэма па падаткаабкладанні фізічных асоб ужо сфарміравана, адпавядае ўсім сусветным практыкам», — адзначыў начальнік Галоўнага ўпраўлення падаткаабкладання фізічных асоб.

Акрамя індэксацыі ставак, удасканальваюцца асобныя кірункі. Так, з 2025 года спыняюць дзеянне льготы, звязаныя з абаротам крыптавалют. У Падатковым кодэксе з'яўляецца артыкул, які вызначае парадак і ўмовы падаткаабкладання такіх даходаў. Ільготы пры аперацыі з крыптавалютай на беларускіх крыптабіржах рэзідэнтаў ПВТ адназначна захаваны. Такім чынам стымулюецца работа ў рамках Беларускага прававога поля з беларускімі арганізацыямі.

Як паведамлялася, Прэзідэнт Беларусі 17 верасня падпісаў Указ № 367 «Аб абароце лічбавых знакаў (токенаў)». Дакумент прыняты ў мэтах павышэння абароненасці грамадзян пры здзяйсненні здзелак з лічбавымі знакамі (токенаў), а таксама ліквідацыі магчымасці ўключэння крыптавалюты ў ашуканскую і іншую супрацьпраўную дзейнасць. Ён прадугледжвае забарону для фізічных асоб, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў — рэзідэнтаў ПВТ, на куплю і продаж крыптавалюты па-за беларускімі крыптабіржамі (крыптаабменнікамі).

## Стаўка на звышпрыбыткі

Андрэй Кавалеўскі распавёў, каму ў Беларусі могуць налічыць падатак на звышпрыбыткі. Як вядома, з 1 студзеня 2024 года прадугледжана новая стаўка падаходнага падатку ў памеры 25 %. Яна прымяняецца толькі ў дачыненні да трох відаў даходаў (працоўныя даходы; дывідэнды; даходы па грамадзянска-прававых дагаворах, прадметам якіх з'яўляюцца выкананне работ, аказанне паслуг і стварэнне аб'ектаў інтэлектуальнай уласнасці), якія перавысілі сумарна 200 тысяч рублёў за год. Фізічныя асобы, чые даходы за год, пачынаючы з 2024 года, падлягаюць абкладанню падаткам на звышпрыбыткі, павінны будуць самастойна прадстаўляць падатковую дэкларацыю па падаходным падатку з фізічных асоб.

«Фізічная асоба, якая за год ад беларускай арганізацыі па трох відах даходаў зарабіць больш за 200 тысяч рублёў, павінна па выніках 2024 года (літаральна праз два месяцы пасля заканчэння года) прадставіць у падатковыя органы падатковую дэкларацыю, дзе адлюстраваць гэтыя даходы. Далей падатковы орган суму перавышэння пералічыць па стаўцы 25 %, улічыць той падатак, які на працягу года быў выплачаны, і, адпаведна, розніцу прад'явіць да падаткаабкладання. Гэта значыць, можна весці гаворку пра даплату 12 % з сумы, якая перавысіла 200 тысяч рублёў», — растлумачыў Андрэй Кавалеўскі.

Ён падкрэсліў, што гаворка ідзе менавіта аб трох вышэйпералічаных відах даходаў. У іх не ўключаюцца даходы ад продажу нерухомасці. Звычайная стаўка падаходнага падатку для фізічных асоб з заробкаў і асноўнай колькасці іншых выплат — 13 %.

**Сяргей КУРКАЧ.**

---

Весткі з Кітая

# МІНСК НАВЕДАЎ ДЫРЭКТАР КІТАЙСКАГА ЦЭНТРА

**У Саюза пісьменнікаў Беларусі склаліся добрыя адносіны з Цэнтрам вывучэння Беларусі, які працуе ва Усходне-Кітайскім педагагічным універсітэце ў Шанхаі. Днямі яго кіраўнік Бэй Вэньлі наведаў Мінск.**

Беларуская літаратура ўсё шырэй прыходзіць да кітайскага чытача. І шмат дзеля гэтага робяць менавіта ў цэнтрах вывучэння Беларусі, якія існуюць у розных гарадах Паднябеснай, не толькі ў Пекіне. Адзін з найстарэйшых працуе ва Усходне-Кітайскім педагагічным універсітэце ў Шанхаі. Кіруе яго дзейнасцю дасведчаны ў беларускай тэме даследчык Бэй Вэньлі, які ў свой час працаваў дыпламатам у Мінску.

Цэнтр не пакідае па-за ўвагай беларускае прыгожае пісьменства. «У нас фарміруецца неблагая бібліятэка беларускай літаратуры, — расказвае кіраўнік установы, — мы імкнёмся развіць зацікаўленні беларускай мовай у студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў. Удзельнічаем у розных мерапрыемствах у фармаце анлайн з беларускімі асветнікамі ўстановамі. У прыватнасці, я прыняў удзел у адкрыцці Тыдня кітайскай культуры і літаратуры, які наладзіла Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага супольна з Саюзам пісьменнікаў Беларусі, Выдавецкім домам «Звязда». Мы імкнёмся прыцягнуць увагу нашых выкладчыкаў, аспірантаў да кампаратывісцкіх прац, скіраваных на супольнае, параўнальнае даследаванне беларускай і кітайскай літаратур. У Шанхаі, як і ў Пекіне, яшчэ ў 1950-я гады выходзілі кнігі беларускіх пісьменнікаў у перакладзе на кітайскую мову. Гэта, лічу, таксама павінна стаць тэмай гісторыка-літаратурнага, гісторыка-кніжнага росшуку...»

Днямі госцю з Шанхая перададзена Грамата Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа, якой Бэй Вэньлі адзначаны «за прапаганду творчасці Якуба Коласа ў Кітаі». Таксама дырэктар Цэнтра вывучэння Беларусі Усходне-Кітайскага педагагічнага ўніверсітэта адзначаны Граматай Саюза пісьменнікаў Беларусі.

**Кастусь ХАДЫКА.**

# Якасць адукацыі. Беларускі прыклад

## У Мінску прайшла Міжнародная навукова-метадычная канферэнцыя па забеспячэнні якасці адукацыі

**Другое па ліку мерапрыемства падобнага фармату працавала ў штаб-кватэры Садружнасці Незалежных Дзяржаў і сабрала шматлікую аўдыторыю. У сталіцу Беларусі прыбылі прадстаўнікі міністэрстваў адукацыі, арганізацый па забеспячэнні якасці адукацыі і адукацыйных устаноў Азербайджана, Казахстана, Расіі, Таджыкістана, Узбекістана. Такім чынам, краіны СНД працягваюць распрацоўку агульных падыходаў да забеспячэння якасці вышэйшай адукацыі. Пытанні, якія былі вылучаны на абмеркаванне, датычыліся сучасных праблем у гэтай галіне ў дзяржавах — удзельніцах СНД, выпрацоўцы адзіных падыходаў да вызначэння крытэрыяў ацэнкі і кіравання якасцю адукацыі і шэраг іншых аспектаў.**

Некалькі апошніх гадоў Беларуская сістэма адукацыі інтэнсіўна ўдасканальвалася і не толькі дасягнула на гэтым шляху поспеху, але і набыла салідны вопыт, якім з удзельнікамі канферэнцыі дзяліліся прадстаўнікі галіны. І які з натхненнем быў прыняты і ўзяты на ўзбраенне спецыялістамі сферы адукацыі іншых краін.

### ЭВАЛЮЦЫЯ ЯКАСЦІ

— Тэма сённяшняй канферэнцыі цікавіць усіх, таму што дзяржава на поўным узроўні развіцця разумее, што чалавечы капітал ключавы ў сістэме, без яго не можа быць развіцця любога грамадства. Беларусь нездарма з'яўляецца ініцыятарам мерапрыемства, бо ў пытаннях якасці адукацыі за перыяд суверэнітэту мы прайшлі заўважную эвалюцыю, — сказаў **намеснік міністра адукацыі Аляксандр КАДЛУБАЙ**.

Ён адзначыў, што ў краіне выбудавана дакладная сістэма. Пачатак яе — ацэнка якасці атэстацыі школьнікаў, навучэнцаў у сістэме каледжаў, студэнтаў ВНУ. А завяршальны пункт — непасрэдна кантроль якасці ў цэлым ва ўстановах адукацыі: навучальных планаў, праграм, усяго, што рэгламентуецца нарматыўна-прававой базай у гэтай сферы. Аляксандр Кадлубай выказаў упэўненасць, што калегі з іншых дзяржаў таксама маюць цікавы досвед арганізацыі гэтых працэсаў.

— Мы павінны быць у курсе, якія новыя выклікі сёння нам дыктуюць працэсы глабалізацыі, інфарматызацыі, таму што гэта таксама датычыцца пытанняў якасці адукацыі, якія нельга здымаць з рахункаў. Бо грамадства імкліва развіваецца: гэта і дасягненні штучнага інтэлекту, і лічбавізацыя, гэта пакаленні новых навучэнцаў. Усё гэта выклікі, да іх нам неабходна рыхтаваць педагогаў новай фармацыі, — падкрэсліў намеснік міністра.



Ён таксама зазначыў, што калегам з СНД будзе цікавая беларуская сістэма кантролю ведаў навучэнцаў.

— У прыватнасці, наша Нацыянальнае даследаванне якасці адукацыі (НІКО — «**Зв.**»). На з'ездзе настаўнікаў СНД мы прапанавалі маштабаваць гэты вопыт на пляцоўцы Садружнасці, калегі прапанову падтрымалі, — расказаў Аляксандр Мікалаевіч.

### НА ЎСІХ УЗРОЎНЯХ

Неабходнасць інтэграцыі ў сферы адукацыі пацвердзіла і **саветнік дэпартамента па супрацоўніцтве ў палітычнай, гуманітарнай і сацыяльнай сферах Выканаўчага камітэта СНД Галіна КАЗАК**. Яна прадставіла інфармацыю аб напрамках развіцця агульнай адукацыйнай прасторы Садружнасці і заўважыла, што развіццё інтэграцыі ў сферы адукацыі рэгламентуецца Пагадненнем аб супрацоўніцтве ў галіне адукацыі, падпісаным кіраўнікамі ўрадаў СНД 15 мая 1992 года. Другім асноватворным дакументам з'яўляецца Пагадненне аб супрацоўніцтве па фарміраванні адзінай (агульнай) адукацыйнай прасторы Садружнасці Незалежных Дзяржаў ад 17 студзеня 1997 года.

— Інтэграцыйныя працэсы накіраваны на далейшае ўмацаванне супрацоўніцтва па забеспячэнні якасці і даступнасці адукацыі на ўсіх узроўнях у дзяржавах СНД, — паведаміла саветнік. — Удасканальваецца сфера падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі высокакваліфікаваных і матываваных спецыялістаў, якія выклікаюць інтарэс для эканамічнага і сацыяльнага развіцця дзяржаў Садружнасці. Робіцца практычныя крокі па ўзаемадзеянні ў галіне атэстацыі навуковых і навукова-педагагічных кадраў. Рэалізацыя пастаўленых задач ажыццяўляецца пад кіраўніцтвам Савета па супрацоўніцтве ў галіне адукацыі дзяржаў — удзельніц СНД.

Галіна Казак праінфармавала, што ўсяго ў сферы адукацыі вышэйшымі органамі СНД прынята 52 дакументы. Акрамя іх, ужо завершана работа над праектамі Канцэпцыі забеспячэння якасці прафесійнай адукацыі дзяржаў — удзельніц Садружнасці і Плана мерапрыемстваў па яе рэалізацыі. Створана Рабочая група па распрацоўцы праекта Пагаднення аб узаемным прызнанні дакументаў аб вучоных ступенях дзяржаў — удзельніц СНД.

Яна дадала, што для сістэмнага разгляду прапаноў і іншых наспелых пытанняў у галіне атэстацыі навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі на прасторы СНД патрэбны спецыяльны орган. Сёння пад эгідай Савета ў сферы адукацыі Садружнасці ажыццяўляюць сваю дзейнасць 18 базавых арганізацый.

Яшчэ адзін праект, «Сеткавы ўніверсітэт СНД», па словах Галіны Казак, стаў знакавым на адукацыйнай прасторы Садружнасці. У ім сёння бяруць удзел 49 ВНУ з 9 краін СНД. А за 14 гадоў, з 2010 да 2024, навучанне ў іх прайшлі 1436 магістрантаў.

— Дзякуючы дзейнасці Савета і прынятым вышэйшымі органамі Садружнасці дакументам адукацыйная прастора СНД працягвае дынамічна развівацца. Праводзяцца шматлікія міжнародныя мерапрыемствы і рэалізоўваюцца адукацыйныя праекты. Удасканальваецца нарматыўна-прававая база, аказваецца падтрымка базавым арганізацыям СНД у сферы адукацыі. На чарговым пасяджэнні Савета 12 лістапада 2024 года ў Бішкеку пад старшынствам Кыргызскай Рэспублікі трэба будзе прааналізаваць выкананне пастаўленых задач і вызначыць перспектывы далейшага ўзаемадзеяння паміж дзяржавамі на адукацыйнай прасторы Садружнасці, — падкрэсліла саветнік.

Закранула яна і работу З'езда настаўнікаў і работнікаў адукацыі дзяржаў — удзельніц СНД. На працягу 14 гадоў гэты аўтарытэтны орган быў і застаецца платформай для дэманстрацыі педагагічных дасягненняў і вызначэння перспектыў далейшага супрацоўніцтва ў сферы адукацыі. Галіна Казак распавяла ўдзельнікам канферэнцыі аб выніках праведзенага 3—4 кастрычніка ў Ерэване VIII З'езда і паведаміла, што наступны, дзявяты па ліку з'езд, адбудзецца ў 2026 годзе ў Беларусі.

### РЭАЛІЗАВАНА НА ПРАКТЫЦЫ

Як ужо было сказана вышэй, замежныя ўдзельнікі форуму былі надзвычай уражаны тымі напрацоўкамі і дасягненнямі, якія не толькі існуюць, але і актыўна выкарыстоўваюцца ў сферы адукацыі Беларусі.

Узяць, напрыклад, правядзенне Нацыянальнага даследавання якасці адукацыі. Новае для Беларусі даследаванне, накіраванае на атрыманне аб'ектыўнай інфармацыі аб стане сістэмы агульнай базавай адукацыі, праводзілася ў 2023 годзе.

— Па выніках даследавання распрацавана дарожная карта па фарміраванні функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў устаноў адукацыі, — сказала **рэктар Акадэміі адукацыі Ірына СТАРАВОЙТАВА**. — Плануем праводзіць даследаванне раз на тры гады. Такі падыход дасць магчымасць адсочваць дынаміку развіцця нацыянальнай сістэмы адукацыі, уключаючы ўзровень адукацыйных дасягненняў навучэнцаў.

Паводле яе слоў, на першы раз узялі для даследавання чатыры віды функцыянальнай адукаванасці: чытацкая, матэматычная, натуральна-навуковая і фінансавая. На перспектыву гэты спіс плануецца значна пашырыць і ўключыць у яго інфармацыйную адукаванасць, крытычнае мысленне, крэатыўнасць, эмацыянальны інтэлект.

Умовы для паступлення матываваных і адораных дзяцей — яшчэ адзін вопыт беларускай сістэмы адукацыі, які вельмі зацікавіў калег з СНД. Аб тым, наколькі дакладна сфармуляваны ўмовы для паступлення абітурыентаў, і аб тым, наколькі гэты працэс празрысты, расказала **намеснік дырэктара Дэпартамента кантролю якасці адукацыі Міністэрства адукацыі Алена ЗЯМНОВА**. Яна ж агучыла і вельмі «гаворачыя» лічбы.

— У 2024 годзе практычна ў два разы павялічылася колькасць адораных і матываваных дзяцей, залічаных у ВНУ без уступных іспытаў. У тым ліку больш як у тры разы — выпускнікоў Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка, больш як у два разы — пераможцаў міжнародных, рэспубліканскіх, абласных алімпіяд, практычна ў два разы — уладальнікаў залатога, сярэбранага медалёў або дыплома з адзнакай аб прафесійна-тэхнічнай або сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Да ўступнай кампаніі 2024 года былі скарэкціраваны ўмовы паступлення ў абласныя ВНУ некаторых катэгорый абітурыентаў з мэтай падтрымаць як самі абласныя ўніверсітэты, так і насыціць эканоміку рэгіёнаў неабходнымі спецыялістамі. З гэтай задачай таксама справіліся.

— 375 пераможцаў універсітэцкіх алімпіяд залічылі менавіта ў гэтыя вышэйшыя навучальныя ўстановы, — канстатавала дырэктар дэпартамента. І адзначыла, што любая сістэма адукацыі павінна быць арыентавана на падрыхтоўку кваліфікаваных кадраў пад патрэбы эканомікі. Таму жыццёва важна, каб у ВНУ прыходзіла найбольш здольная моладзь.

**Член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы Міхаіл МІРОНЧЫК** праінфармаваў аб тым, што дэпутаты прынялі ў першым чытанні законапраект «Аб змяненні законаў па пытаннях адукацыі», і падкрэсліў, што ўсе карэкціроўкі, унесеныя ў Кодэкс аб адукацыі, накіраваны на далейшае павышэнне якасці адукацыі і ўрэгуляванне важных пытанняў практычнага характару.

Ён спыніўся на некаторых важных навацыях, унесеных у дакумент. І агучыў, што з прыняццем заканадаўчага дакумента будзе выключана магчымасць рэалізацыі адукацыйных праграм дашкольнай і спецыяльнай адукацыі індывідуальнымі прадпрымальнікамі. Вылучыў навацыю па размеркаванні мэтавікоў і расказаў аб абавязках, якія ўводзяцца для арганізацый — заказчыкаў кадраў па кампенсацыі сродкаў, затрачаных дзяржавай на падрыхтоўку спецыяліста ў выпадку неабгрунтаванага скасавання або невыканання дагавора аб мэтавай падрыхтоўцы.

**Алена ВІНАГРАДАВА.**

Падзея

# КАРЭЛІЧЫ — АДРАС БЕЛАРУСКАГА КНІЖНІЦТВА

**Традыцыяй стала правядзенне на Гродзеншчыне міжрэгіянальнага фестывалю «ПРОДвижение КНИГИ. Библиотечные ступени». Адрас — гарадскі пасёлак Карэлічы. Сёлета кніжнае свята, арганізаванае калектывам Карэліцкай раённай бібліятэкі, было прысвечана Году міру і стваральнай працы.**

У праграме фестывалю, удзел у якім прынялі Навагрудская, Воранаўская, Нясвіжская і Ляхавіцкая раённыя бібліятэкі, было намала мерапрыемстваў, скіраваных на прапаганду кнігі, на разгляд розных бібліятэчных навацый. Дарэчы, у фармаце анлайн у свяце прыняла ўдзел і Уздзенская раённая бібліятэка. Перш-наперш былі прэзентаваны бібліятэчныя пляцоўкі: «Бібліятэка як брэнд», «Прасоўванне бібліятэкі ў сацыяльных сетках», «База даных уласнай генерацыі». У час работы фестывалю праходзіў продаж кніг беларускіх кніжных і медыйных выдавецтваў. Шкада, што на свяце іх было ўсяго толькі тры: Выдавецкі дом «Звязда», выдавецтва «Мастацкая літаратура» і рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Адукацыя і выхаванне», апошняе з якіх пазнаёміла не толькі з папулярнымі асветніцкімі выданнямі, але і прадставіла часопіс «Рюкзачок», які добра знаёмы школьнікам нашай краіны. Магчыма, з часам да кніжнага свята ў знакамітым, багатым на гісторыю рэгіёне далучацца і іншыя дзяржаўныя і прыватныя выдавецтвы. Будзем на гэта спадзявацца!..

У СШ № 1 г. п. Карэлічы прайшла сустрэча са старшынёю Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі паэтэсай і празаікам Людмілай Кебіч, якая прадставіла вучням і настаўнікам сваю новую кнігу прозы «Жыццёвыя путы», зборнік пабачыў свет у Выдавецкім доме «Звязда». Удзел у сустрэчы прыняў і добра вядомы на Гродзеншчыне паэт Мікалай Іваноўскі. Таксама на фестывалі была прэзентавана кніга мясцовага краязнаўца Святланы Кошур «Праз паціну часу», што толькі што прыйшла з друкарні. Дарэчы, некалькі дзён назад гэтае выданне, што таксама выйшла ў Выдавецкім доме «Звязда», было прэзентавана ў Навагрудскай раённай бібліятэцы. Пад адной вокладкай член Саюза пісьменнікаў Беларусі Святлана Кошур сабрала свае краязнаўчыя нарысы, якія распавядаюць пра людзей і мясціны Навагрудчыны, Карэліччыны, пра розныя гістарычныя адрэзкі часу.

Кацярына Хадасевіч-Лісавая, аўтар болей як дзесятка кніг пра Вухуціка і іншых не меней знакамітых герояў, упадабаных дзіцячым чытачом, таксама наведалася ў Карэлічы. Пісьменніца прэзентавала свае новыя кнігі, якія сістэмна, з году ў год, выходзяць у Выдавецкім доме «Звязда». Кацярына Хадасевіч-Лісавая расказала гаспадарам фестывалю і яго гасцям з розных куткоў Гродзеншчыны, Міншчыны і Берасцейшчыны і пра свае новыя творчыя планы. Застаецца толькі сачыць за навінкамі, што неўзабаве пабачаць свет. Яшчэ адзін аўтар Выдавецкага дома «Звязда», прадстаўляючы свае кнігі, займеў шырокую чытацкую ўвагу, — размова пра Дзмітрыя Нікалаева. Сустрэча з ім на фестывалі сабрала нямала прыхільнікаў творчасці дзіцячага пісьменніка. Пра свае новыя кнігі, што выйшлі ў Выдавецкім доме «Звязда», расказаў чытачам і вядомы паэт і празаік, галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура», галоўны рэдактар часопіса «Полымя», старшыня секцыі паэзіі Саюза пісьменнікаў Беларусі Віктар Шніп. «Кастусь і Міёна», «Заўтра была адліга — 3», «Васільковы мёд» — назвы толькі некаторых з іх.

Сёлета вельмі шмат розных кніжных фестываляў альбо фестываляў, дзе прапаганда кнігі, чытання займала пачэснае месца, прайшло і ў Мінску, і ў іншых гарадах краіны. Карэлічы са сваім творчым, багатым на адкрыцці праектам займаюць важнае месца ў шэрагу «кніжных адрасоў» Беларусі. Калектыў Карэліцкай раённай бібліятэкі на чале са сваім кіраўніком Ліліяй Арцюх робіць дзеля гэтага неверагодна шмат. Карэліччына — унікальная старонка ў гісторыі беларускага прыгожага пісьменства. З гэтым краем звязаны імёны Уладзіміра Калесніка, народнага пісьменніка Беларусі Янкі Брыля, народнага паэта Беларусі Максіма Танка, народнага песняра Беларусі Якуба Коласа... У гэтых слаўных мясцінах нарадзіліся празаік і літаратуразнавец Уладзімір Навумовіч, паэт і акцёр Пятро Ламан, паэт і дзіцячы пісьменнік, мастак Мікола Бусько, паэт і сцэнарыст Раман Тармола-Мірскі і іншыя яркія творчыя асобы. А яшчэ варта нагадаць, што на Карэліччыне, у Міры, у 2002 годзе прайшоў Дзень беларускага пісьменства.

**Раман СЭРВАЧ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
13 лістапада 2024 г. № 43 (776)
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

# «РАБОТА З ЛЮДЗЬМІ ПАВІННА БЫЦЬ У ПРЫЯРЫТЭЦЕ»



**ТАКУЮ думку агучыла Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА, падводзячы вынікі адзінага дня прыёму грамадзян сенатарамі ў Віцебскай вобласці. Пытанні пенсіённага забеспячэння, сацыяльная падтрымка — гэтыя і іншыя тэмы ўзнімаліся ў кожным раённым цэнтры паўночнага рэгіёна.**







## Зварот асабісты — праблема агульная

Старшыня Савета Рэспублікі сустракалася з людзьмі ў Расонскім райвыканкаме. На прыём да Наталлі Качанавай прыехалі людзі з усіх абласцей і Мінска.

Мужчына з Віцебска трапіў у махлярскую пастку, набыўшы аўтамабіль. Прадавец сцвярджае, што заяўнік не выплаціў усю суму цалкам. Праваахоўныя органы адзначаюць, што пацярпелых у дадзеным выпадку некалькі, ужо вядзецца расследаванне, махляра, які хаваецца, шукаюць. Старшыня Савета Рэспублікі паабяцала вывучыць сітуацыю больш глыбока і ўзяць пытанне на кантроль, а таксама даручыла прадстаўнікам мясцовай і абласной улады правесці інфармаванне, каб спецыялісты расказалі пра падобныя ашуканскія схемы.

Шматдзетная маці з абласнога цэнтра выхоўвае дзіця з інваліднасцю. Яна расказала, што, паводле дзейнага заканадаўства, ёй не даюць бальнічны ліст, калі дзіця праходзіць рэабілітацыю ў санаторыі. Жанчыне ў такіх выпадках дапамагае маці, якая ездзіць з унукам на рэабілітацыю за свой кошт. Наталля Качанава падкрэсліла, што пытанне значнае, палітыка дзяржавы накіравана на падтрымку сем'яў, у тым ліку шматдзетных і тых, хто выхоўвае дзяцей з інваліднасцю. Тэма важная, сказала спікер, і яе трэба абмяркоўваць з міністэрствамі аховы здароўя, працы і сацабароны.

Жыхарка Рэчыцы прыйшла на прыём з калектыўным зваротам ад мам, якія выхоўваюць паўналетніх дзяцей-інвалідаў першай групы. Яна папрасіла дапамагчы з захаваннем дапамог па доглядзе інваліда і пасля яго паўналецця, а таксама перагледзець магчымасць шпіталізацыі такіх дарослых дзяцей разам з мамамі.

Мужчына з Магілёўскай вобласці разам з жонкай пяты год ездзіць у адну з гаспадарак Смалявіцкага раёна ў вясенне-асенні перыяд на заробкі. Пара і сёлета працавала жывёлаводамі, а вось зарплату з ліпеня да кастрычніка яны так і не ўбачылі. Наталля Іванаўна даручыла разабрацца ў сітуацыі кіраўніцтву Магілёўскага аблвыканкама і выплаціць напрацаванае людзьмі ў поўным аб'ёме.

Пенсіянерка з вёскі Кураполле Пастаўскага раёна паскардзілася на перасяленне без яе згоды. Шматкватэрны дом, у якім на працягу амаль 40 гадоў жыла заяўніца, прыйшоў у непрыдатнасць, жыхароў перасялілі ў Паставы. Аднак, па словах жанчыны, кватэра вельмі халодная, цэнтральнае ацяпленне працуе ледзь-ледзь, а электраацяпленне — у далёкай перспектыве. Старшыня Савета Рэспублікі даручыла пытанне кіраўніку дэпутацкага корпуса Віцебшчыны Дзмітрыю Дзямідаву, падкрэсліўшы, што перасяліць людзей у іншы населены пункт можна толькі з афіцыйнай згоды чалавека.

Жанчына з Оршы папрасіла дапамагчы ў добраўпарадкаванні дарог у прыватным сектары. Некалькі гадоў таму, пасля звароту да Наталлі Качанавай, вуліцу і некалькі завулкаў адрамантавалі, пасыпалі друзам. З цягам часу гэта пакрыццё прыйшло ў непрыдатнасць, людзі летам задыхаюцца ад пяску і пылу. Старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў запэўніў заяўніцу, што ўказаныя вуліцы ўжо закладзены ў план асфальтавання.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

## Калектыўны дагавор — у азначаныя тэрміны



**На рабочай сустрэчы Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Наталлі КАЧАНАВАЙ са Старшынёй Фэдэрацыі прафсаюзаў Юрыем СЯНЬКО абмеркаваны пытанні далейшага ўдасканалення працоўнага заканадаўства.**

Як падкрэсліў Юрый Сянько, прафсаюзы на пастаяннай аснове ўдзельнічаюць у распрацоўцы праектаў нарматыўных прававых актаў, уносяць свае заўвагі і прапановы. Ініцыятывы нацыянальнага прафцэнтра, як правіла, падтрымліваюцца заканадаўцамі.

— Усе нашы прапановы ідуць ад жыцця — ад працоўных калектываў, нашых членаў прафсаюза. Адно з актуальных пытанняў на сёння — стварэнне на заканадаўчым узроўні дадатковых умоў для пашырэння практыкі заключэння калектыўных дагавораў, — адзначыў Юрый Сянько. — Сёння ў краіне падпісана каля 18 тысяч такіх лакальных дакументаў. Дзякуючы гэтаму работнікі прадпрыемстваў і арганізацый гарантавана атрымліваюць дадатковыя водпускі, выплаты, падтрымку ў розных сітуацыях. Разам з тым у сваёй працы мы бачым выпадкі, калі наймальнікі адмаўляюцца ад заключэння калектыўнага дагавора ці зацягваюць перагаворы па іх заключэнні. Пры гэтым недзе работнікам даюць нейкія выплаты, прэміі. Але гэта эпізадычная, неабавязковая падтрымка. А ў выпадку калі заключаны калдагавор, усё, што ў ім прапісана, работнікі атрымаюць стопрацэнтна.

Прафсаюзны лідар краіны дадаў, што сёння ў шэрагу краін ЕАЭС ёсць практыка, калі на заканадаўчым узроўні замацаваны тэрмін, на працягу якога павінен быць падпісаны калектыўны дагавор, — тры ці шэсць месяцаў. «Мы мяркуем, што такую норму неабходна ўнесці і ў наша заканадаўства. Гэта адназначна пойдзе на карысць людзям, працоўным калектывам, павысіць узровень гарантый для чалавека працы», — падзяліўся старшыня ФПБ.

Таксама на працоўнай сустрэчы абмяркоўвалася пытанне працы з моладдзю. Як расказаў Юрый Сянько, прафсаюзы аддаюць асаблівую ўвагу пытанням сацыяльнай падтрымкі маладых людзей. У першую чаргу праз уключэнне ў пагадненні і калектыўныя дагаворы спецыяльных гарантый для маладых людзей. Рэалізуюцца і праекты па падтрымцы таленавітай моладзі.

Напрыклад, штогод ФПБ прызначае стыпендыі навучэнцам і студэнтам, якія сумяшчаюць добрыя паказчыкі ў вучобе і актыўную грамадзянскую пазіцыю. Праводзіцца і пастаянная работа па навучанні прафсаюзнага маладзёжнага актыву. Так, за апошнія гады больш як шэсць тысяч маладых людзей прайшлі тэматычныя навучальныя курсы, дзе нараўне з прафсаюзнымі тэмамі разглядаюцца пытанні грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны і грамадзянска-патрыятычнага выхавання.

## Чалавек — на першым месцы

**Беларусь сёння займае адно з вядучых месцаў у працэсе сацыяльнага развіцця, заявіў Нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Сяргей ХАМЕНКА журналістам перад пачаткам пасяджэння Савета па ўстойлівым развіцці.**

«Гэта планавае мерапрыемства па падвядзенні вынікаў дзейнасці па дасягненні Мэт устойлівага развіцця, — адзначыў Сяргей Хаменка. — Нам ёсць чым ганарыцца і дзякуючы кіраўніку дзяржавы, нашаму ўраду, дзейнасці рэгіёнаў Беларусь на сёння займае адно з вядучых месцаў у працэсе сацыяльнага развіцця. Прынцып «усё для чалавека і ўсё ў імя чалавека» рэалізуецца ў поўнай меры. Сёння мы падводзім вынікі ў галіне эканомікі, аховы здароўя, адукацыі. Асноўнае пытанне — разгляд праекта Нацыянальнай стратэгіі развіцця на найбліжэйшую будучыню. Усё накіравана толькі на тое, каб наша краіна развівалася, захоўвала ўсё, што мы маем».

На Савеце па ўстойлівым развіцці прадстаўнікі рэгіёнаў таксама расказалі пра тое, як будзе арганізавана работа на месцах зыходзячы з той стратэгічнай лініі, якую праводзяць кіраўнік дзяржавы і ўрад.

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**

# «РАБОТА З ЛЮДЗЬМІ ПАВІННА БЫЦЬ У ПРЫЯРЫТЭЦЕ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*

Маладая сям'я з Асіповіцкага раёна займаецца фермерствам, вырошчвае дурніцы. Пара мэтанакіравана некалькі гадоў таму пераехала з горада ў вёску, аднак апошнім часам стала вострае пытанне з недахопам участкаў для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі і фермерства, мясцовыя ўлады не могуць прапанаваць сям'і зямельныя ўчасткі. «Пытанне вырашым абавязкова. Як гэта так? Маладыя людзі хочуць працаваць у вёсцы, а ім не дазваляюць», — сказала Наталля Качанава і паабяцала асабіста прыехаць да сям'і.

Жанчыны з Наваполацка ўзнялі пытанне аб нядобрасумленнай рабоце старшыні садовага таварыства Нафтаннік-2. Заяўнік з Копысі паскардзіўся на работу мясцовага цэнтра народнай творчасці і работу мясцовых улад у цэлым. Наталля Качанава паабяцала правесці выязное пасяджэнне прэзідыума менавіта ў Копысі, ацаніць работу сельскага Савета і канкрэтнай установы культуры.

З калектыўным зваротам на прыём у Расоны прыехалі жыхаркі гарадскога пасёлка Ушачы. Жанчыны безвынікова звярталіся да раённых службаў з просьбай заасфальтаваць вуліцу даўжынёй 1 кіламетр 70 метраў. Наталля Іванаўна даручыла вырашыць праблему кіраўніку паўночнага рэгіёна Аляксандру Субоціну, падкрэсліўшы, што трэба навучыцца чуць людзей і размаўляць з імі, каб такія дробныя пытанні вырашаць на мясцовым узроўні.





Жыхарка Віцебска дзесяць гадоў таму набыла дом з участкам сем сотак. З цягам часу замяніла сетку-рабіцу на бетонны забор на старых металічных слупах, не пераносячы іх. Цяпер жанчына ваюе з суседкай, якая не дае магчымасці заяўніцы ездзіць па агульнай дарозе паміж двух дамоў. У аблвыканкаме адзначылі, што быццам бы жанчына заняла 14 квадратных метраў тэрыторыі агульнага карыстання, бо па дакументах яе ўчастак меншы. Цікава, што ніякіх афіцыйных замераў зямельныя службы не праводзілі. Старшыня Савета Рэспублікі дала даручэнне зрабіць дакладныя замеры.

Падводзячы вынікі прыёму грамадзян, Наталля Качанава падкрэсліла, што такая работа для кожнага кіраўніка павінна быць у прыярытэце. «Гэта зрэз таго, як працуюць на месцах прынятыя законы, як працуюць нашы органы кіравання, кіраўнікі прадпрыемстваў, арганізацый, для таго каб забяспечыць задачы, пастаўленыя Прэзідэнтам нашай краіны. Перш за ўсё гэта, вядома, людзі», — заключыла спікер.

## З выездам на месца

**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Леанід ЗАЯЦ** сустракаўся з людзьмі ў Аршанскім райвыканкаме. Грамадзяне звярталіся з пытаннямі атрымання зямельных участкаў для вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі, рамонту дарог, камунальнага абслугоўвання шматкватэрных дамоў. «У Савеце Рэспублікі ўжо склалася практыка выязджаць у рэгіёны краіны, каб пачуць ад людзей застарэлыя праблемы, якія неабходна вырашыць аператыўна для камфортнага жыцця грамадзян. На прыёме ў Аршанскім райвыканкаме мы ўбачылі пытанні, якія ўзнімаюць жыццём, яны не надуманыя. Радуе, што мясцовыя ўлады гэтыя пытанні разумеюць і кіраўніцтва поўнасцю за тое, каб аперытаўна зняць праблемы людзей», — падкрэсліў Леанід Заяц.

У рамках адзінага дня прыёму з навапалачанамі сустрэўся **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ.** Сенатару паступілі звароты, якія датычыліся пенсіённага заканадаўства, прадпрымальніцкай дзейнасці, а таксама нюансаў пастановы аб увядзенні забароны на вываз за межы дзяржавы асобных відаў прамысловых тавараў.

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Андрэй СІДАРАЎ** правёў прыём у Бешанковічах. Значны пласт пытанняў быў прысвечаны якасці дарожнага пакрыцця. Для больш дэталёвага вывучэння праблемы сенатар разам з кіраўніцтвам раёна выехаў на месца. «Дарожная праблема, на жаль, актуальная для многіх рэгіёнаў краіны. Безумоўна, што ў яе вырашэнні патрэбна сістэма. У кожным раёне павінна быць свая дарожная карта, у якой будуць адлюстроўвацца ўсе праблемныя моманты, звязаныя са станам дарог, і план далейшых дзеянняў», — адзначыў Андрэй Сідараў.

У Гарадоцкім райвыканкаме праблемы грамадзян выслухаў **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Глеб ЛАПІЦКІ.** На прыёме ўзнімаліся пытанні атрымання жылля, працаўладкавання. Аўтар шматлікіх кніг Наталля Саветная прэзентавала сенатару новы зборнік паэзіі, прозы і публіцыстыкі «Победили! Перамаглі!».

Падводзячы вынікі, Глеб Аляксандравіч адзначыў, што Гарадоччына — адзін з самых непраблемных раёнаў, за які ён адказвае. «Канешне, цяжкасці ёсць, аднак яны не носяць глабальнага характару. Людзі ў большасці сваёй прыходзяць на прыём, каб абмяняцца думкамі. Гэта гаворыць аб выдатнай рабоце ўлады ў розных кірунках», — падкрэсліў Лапіцкі.



**Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Сяргей СІВЕЦ** правёў прыём у Докшыцах. Звароты датычыліся абсталявання свідравіны на прыдамавой тэрыторыі воіна-інтэрнацыяналіста і ўладкавання дзіцяці з псіхічным парушэннем у спецыялізаваную ўстанову сацыяльнай аховы. Пытанні ўзяты на кантроль.

У Мёрскім райвыканкаме выслухала праблемы людзей **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Наталля МАРКОВІЧ.** Да Наталлі Мікалаеўны звярнуліся па дапамогу наконт насычэння таварамі і павелічэння асартыменту крамы ў Шарагах, якую абслугоўвае Ушацкі філіял абласпажыўтаварыства. Пытанне ўзята на кантроль і будзе вырашана ў найбліжэйшы час з дапамогай старшыні райсавета Валерыя Драбо.



**Намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Валерый ГАЙДУКЕВІЧ** правёў прыём у Пастаўскім райвыканкаме. На парадку дня былі пытанні медыцынскага абслугоўвання радавога саставу, прапаршчыкаў і малодшых афіцэраў, якія ўдзельнічалі ў афганскай вайне і іншых канфліктах; капітальнага рамонту жылога фонду. Валерый Гайдукевіч паабяцаў заяўнікам разабрацца з пытаннямі з прыцягненнем зацікаўленых службаў, аказаць дапамогу ў прыняцці неабходных мер рэагавання ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

Жыхары Талачынскага раёна змаглі звярнуцца да **намесніка старшыні Савета Рэспублікі Сяргея ХАМЕНКІ.** Грамадзяне прыйшлі да сенатара з пытаннямі стану дарог і іх добраўпарадкавання, а таксама з праблемамі, якія датычацца іншых сфер дзейнасці. Пры гэтым яны накіраваны як на развіццё рэгіёна, так і на ўдасканаленне нарматыўна-прававой базы. «Галоўнае, што людзі хочуць зрабіць жыццё ў нашай краіне лепшым, бо ўсе мы разумеем, што створанае кіраўніком дзяржавы — неацэнна, але патрабуе далейшага развіцця», — падкрэсліў сенатар і ўзяў кожнае пытанне на асабісты кантроль.

**Член Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Алег РУМО** выслухаў звароты людзей ва Ушацкім райвыканкаме. Грамадзянамі былі агучаны пытанні пераважна асабістага характару, якія датычыліся водазабеспячэння, працаўладкавання, размяшчэння гандлёвых аб'ектаў, бяспекі жыццядзейнасці ў раёне. Для больш дэталёвага разгляду пытанняў Алег Румо выехаў на некаторыя аб'екты.

У Шаркаўшчынскім райвыканкаме прыём грамадзян праводзіла **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Наталля ЯКУБІЦКАЯ.** Да яе звярнуўся жыхар аграгарадка Радзюкі, які доўгі час займаецца пчалярствам, і папрасіў дапамогі ў збыце натуральнай прадукцыі. Мужчына з райцэнтра папрасіў садзейнічання ў працаўладкаванні. Заяўнік на пенсіі, але мае вялікае жаданне працаваць. Яму адразу на прыёме знайшлі вакансію кіроўцы.

Па словах Наталлі Якубіцкай, у рабоце з людзьмі не павінна быць фармальнага падыходу — кожнае пытанне патрабуе комплекснага вывучэння. «Па кожным выпадку трэба разбірацца дэталёва, каб кожны зварот не застаўся без увагі. Усё павінна вырашацца па законе, і грамадзяне павінны быць задаволены вынікам», — падкрэсліла сенатар.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота БелТА**
**і з ТК раённых газет Віцебшчыны.**

# ЗАХАВАНАЯ ПАМЯЦЬ

## Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Галіна БЯЛЯЕВА ратуе ад забыцця месцы пахавання герояў Вялікай Айчыннай вайны



Галіна БЯЛЯЕВА даследуе месца пахавання.

**ГАЛІНА Бяляева — гісторык па адукацыі, вельмі плённа працуе ў кірунку некрапалістыкі. Прадметам яе даследавання з'яўляюцца могілкі, іх вывучэнне і захаванне важных для гісторыі звестак. На жаль, помнікі таксама з часам знікаюць, а разам з імі — вельмі каштоўная інфармацыя. Таму важна паспець захаваць яе. Апошнім часам на грамадзянскіх могілках усё часцей з'яўляюцца закінутыя магілы герояў Вялікай Айчыннай вайны. Калі нашчадкаў няма, гэтыя імёны хутка могуць знікнуць у небыцці. Галіна Бяляева робіць усё для таго, каб гэтага не адбылося.**

### Аб'явы на помніках

Цяпер у цэнтры яе ўвагі Машэкаўскія могілкі ў Магілёве. Яны вельмі старыя, і на іх хапае недагледжаных пахаванняў.

— Вядома, што такая праблема існуе на шматлікіх могілках, але ж усе не праманіторыш, — разважае даследчыца. — На жаль, інфармацыя на помніках савецкага перыяду не раскрывае статус чалавека, кім ён быў пры жыцці. Можна даведацца толькі пра ступень яго сваяцтва з блізкімі: бацька, маці, дачка, сын і гэтак далей. А якую ролю той ці іншы чалавек адыграў у гісторыі, не вядома. Мне ж як некрапалісту цікава гэта ведаць.

У Магілёве доглядам могілак займаецца Спецыялізаваны камбінат абслугоўвання насельніцтва. Ён адсочвае агульны стан месцаў смутку, а вось падтрымліваць у эстэтычным і функцыянальным выглядзе помнікі, агароджы, крыжы, своечасова іх абнаўляць, рэстаўрыраваць — гэта ўжо задача родных памерлага. Калі дагляду на працягу доўгага часу не назіраецца, а помнікі ледзь не развальваюцца, работнікі размяшчаюць на іх аб'явы для сваякоў з заклікам адгукнуцца. Гэтай вясной такая аб'ява трапіла на вочы Галіны Бяляевай, і яна патэлефанавала па пазначаным там нумары. Расказала пра сваё даследаванні і прапанавала камунальнікам супрацоўніцтва. Дамовілася, каб фотаздымкі закінутых помнікаў наўпрост накіроўвалі ёй.

— Мая задача — высветліць, кім быў гэты чалавек у гісторыі, — тлумачыць суразмоўніца. — Па заканадаўстве, калі магілу ніхто не даглядае, яна ліквідуецца. Камунальнікі размяшчаюць аб'явы ў надзеі, што сваякі адгукнуцца. Некаторыя тэлефануюць, але шмат выпадкаў, калі ніхто не адгукаецца гадамі. Магчыма, родных ужо няма або пра чалавека, які пайшоў з жыцця, забыліся.

### Архівы расказваюць

Галіна Бяляева адзначае, што ў месяц атрымлівае ад рытуальнай арганізацыі па 10—50 здымкаў. Яе задача — праверыць па архіўных крыніцах прозвішчы, якія пазначаны на помніках. І вельмі хвалюецца, калі пацвярджаецца, што чалавек быў заслужаны.

— Імя Веры Кузьмінічны Ігнатавай першапачаткова нічога мне не казала, але ў базе даных «Партызаны Беларусі» яно хутка адшукалася, — расказвае дэпутат. — Жанчына — ураджэнка Віцебшчыны, была сувязной горацкай 115-й партызанскай брыгады. Падчас вайны жыла ў вёсцы Сліжы Шклоўскага раёна. Гэту інфармацыю я ўзяла з дакумента 1958 года. У ім жа быў адрас. Вядома, адправілася праверыць, ці засталіся родныя жанчыны. На жаль, у доме, дзе жыла Вера Кузьмінічна, нікога з яе блізкіх не знайшлося. Мясцовыя жыхары, якія яшчэ помняць яе, сказалі, што ў жанчыны была дачка, але яна загінула. Іншымі словамі — магілу сапраўды не было каму даглядаць.

Цяпер дэпутат займаецца пошукам родных Івана Васільевіча



Камандзір мінамётнага разліку Іван Кандратовіч.

Кандратовіча. Яна ўжо высветліла, што ён быў камандзірам мінамётнага разліку, гвардыі старшым сяржантам. Па нацыянальнасці — беларус, нарадзіўся ў 1924 годзе, памёр у 1951-м. Магіла яго была безгаспадарчая ўжо даўно, на ёй нават дрэвы выраслі.

— Чалавек вельмі заслужаны, быў узнагароджаны ордэнамі Славы III ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі «За баявыя заслугі», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За Перамогу над Германіяй», — пералічвае Галіна Бяляева. — Ордэн Славы быў уручаны яму ў 1945 годзе за мужнасць пры ўзяцці вёскі Варкалін: пад прыкрыццём яго мінамёта пяхота амаль без страт істотна пацясніла непрыяцеля. Ён удала супрацьстаяў контратакам ворага і ўтрымаў пазіцыі. А ордэн Чырвонай Зоркі атрымаў у жніўні 44-га за вёску Цялушкі: першы пераправіўся праз раку і агнём кулямёта падавіў баявыя пункты непрыяцеля. Гэтым ён дапамог батальёну своечасова пераправіцца праз раку і вызваліць населены пункт.



Палкоўнік Аляксандр Фофанаў.

Дэпутат таксама палічыла патрэбным замяніць помнік палкоўніку Аляксандру Фофанаву, ураджэнцу Пензенскай губерні. На яго рахунку — тры ордэны Чырвонага Сцяга, якія ён атрымаў у кароткі перыяд з 23 сакавіка да 10 чэрвеня 1945 года, ордэны Айчыннай вайны I ступені і II ступені, ордэн Чырвонай Зоркі. У кастрычніку 1944 года 120-я асобная танкавая брыгада, начальнікам штаба якой ён з'яўляўся, ва ўзаемадзеянні з 371-й стралковай дывізіяй на працягу дня прарвала моцную варожую абарону і выйшла да мяжы з Усходняй Прусіяй. Брыгада вяла баі на тэрыторыі Усходняй Прусіі, удзельнічала ва Усходне-Прускай аперацыі.

### Дадаць важнае

Галіна Бяляева шукае не толькі інфармацыю пра герояў Вялікай Айчыннай вайны, але і спонсараў, якія накіроўваюць свае сродкі на абнаўленне помнікаў. Прызнаецца, сама не чакала, што яе ідэя будзе мець такі сур'ёзны працяг. Першае пачуццё было — цікавасць: чаму помнікі застаюцца без нагляду і дзе родныя памерлых? А ўжо падчас пошукаў, калі высветлілася, кім былі гэтыя людзі, прыйшла думка ўвекавечыць іх памяць.

— Помнікі ўжо заказаны і ў найбліжэйшы час будуць устаноўлены на месцах пахаванняў, — паведаміла народная абранніца. — Хачу дадаць важную інфармацыю на магільныя пліты гэтых людзей, што гэта ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, на іх рахунку — яркія подзвігі, якія яны зрабілі дзеля нашага мірнага жыцця. Цяпер здалёк будзе відаць, што яны — героі.

**Старшыня Чавускага райсавета Анатоль МАЦЮЛІН:**

— На могілках перадусім павінен быць парадак. Калі надмагілле зламалася, а паправіць няма каму, мясцовым органам улады трэба шукаць рэсурсы і аднаўляць яго. Не павінна быць у нас разбураных помнікаў. Асабліва шмат іх цяпер, пасля ўсіх гэтых ураганаў. Заходзіш на могілкі і бачыш крыжы, зламаныя папалам, пагнутую агароджу. Задача нумар адзін мясцовых Саветаў — пасля стыхіі арганізаваць работу па прыборцы небяспечных дрэў і навесці парадак на пашкоджаных пахаваннях.

Што датычыцца пошуку магіл ветэранаў вайны на грамадзянскіх могілках, сэнс у такой рабоце ёсць. Хоць пра чалавека, які прыйшоў з фронту, усё было, па сутнасці, вядома, а калі ён сыходзіў з жыцця, інфармацыя захоўвалася — у сельсавеце, райсавеце, камунгасе і гэтак далей. Вядома, што дзесьці сельсаветы аптымізаваліся, даныя маглі страціцца. Гэта апошнім часам праводзілася ўпарадкаванне, складваліся схемы пахаванняў. Раней за гэтым ніхто не сачыў. Хавалі хто дзе хацеў. Маглі кагосьці прывезці з Магілёва і пахаваць у Чавусах. Цяпер усё пад кантролем. Вядома, што было б добра ведаць, хто з заслужаных людзей пахаваны на тых ці іншых могілках. Мы, калі складалі планы пахаванняў, спрабавалі ўстанаўліваць такія імёны. Але сярод тых, каго ведалі. Шмат хто з'ехаў з раёна сем'ямі, іх магілы засталіся абязлічанымі. Ініцыятыва дэпутата Палаты прадстаўнікоў Галіны Бяляевай цікавая. Асабліва калі зыходзіць з пункту гледжання захавання гістарычнай памяці пра ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Мы ў сваю чаргу дапаможам знайсці рэсурсы для ўвекавечання героя вайны, калі няма яго родных. Наогул, на сельскіх могілках хапае работы. Дзесьці існуюць праблемы з пад'ездамі, агароджай, адсутнасцю дарожак. Але перш за ўсё павінна быць адказнасць людзей за парадак на магілах, якія яны даглядаюць.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з архіва Галіны БЯЛЯЕВАЙ.**

### У тэму

**Мікалай БАРЫСЕНКА, кіраўнік Магілёўскага гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру», ваенны пісьменнік:**

— У апошнія гады, нягледзячы на цеснае супрацоўніцтва ў пытаннях увекавечання памяці з Галоўным упраўленнем ідэалагічнай работы і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама, раённымі ваеннымі камісарыятамі і вялікую работу, якая праводзіцца ў гэтым кірунку, у вобласці (як і па ўсёй Беларусі) з'явілася яшчэ адна праблема. Звязана гэта з тым, што з жыцця практычна пайшлі ветэраны вайны, сыходзяць старажылы, мірныя жыхары — відавочцы і сведкі падзей вайны, пусцеюць і зносяцца вёскі, а з імі губляюцца і пахаванні воінаў, партызан, падпольшчыкаў і проста мірных жыхароў часоў вайны. І хоць у гэтым кірунку шмат чаго робіцца Упраўленнем па ўшанаванні памяці і ахвяр войнаў Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь, мясцовымі органамі ўлады, без грамадскасці, мясцовых жыхароў, школьных пошукавых фарміраванняў паўнавартасна змагацца з гэтым відам бяспамяцтва не атрымаецца. У гэтым пошукавікі клуба «Віккру» пераконваюцца кожны год.

У 2022 годзе пры ўдзеле нашых пошукавікаў сумесна з 52-м пошукавым батальёнам і абласной пракуратурай былі перанесены страчаныя за пасляваенныя гады пахаванні воінаў Чырвонай Арміі і мірных жыхароў у Асіповіцкім, Слаўгарадскім, Клічаўскім, Бабруйскім, Шклоўскім, Магілёўскім раёнах.

Апошнім часам з'яўляюцца самаробна абазначаныя месцы пахаванняў часоў вайны, якія ствараюць так званыя чорныя капальнікі ці мясцовыя жыхары (г. Магілёў, Магілёўскі раён). Паведамляць у мясцовыя сельскія Саветы яны асцерагаюцца, а таму выходзяць на пошукавікаў і інфармуюць пра такія месцы. У апошнія гады пяць такіх пахаванняў у Магілёўскім, Чавускім, Быхаўскім раёнах былі перанесены ў найбліжэйшыя ўлічаныя воінскія брацкія магілы.

Да гэтага часу на грамадзянскіх могілках вобласці застаецца значная колькасць абязлічаных пахаванняў як воінаў Чырвонай Арміі 1941 года і часоў акупацыі, так і мірных жыхароў, загінулых ад рук нацысцкіх карнікаў. Такія знойдзены ў Слаўгарадскім, Магілёўскім, Чавускім, Быхаўскім раёнах... Па інфармацыі пошукавікаў і з дапамогай фінансавання мясцовых улад у Магілёўскім, Шклоўскім і Чавускім раёнах добраўпарадкавана з устанаўленнем памятных знакаў сем такіх пахаванняў.

Як можна сёння актывізаваць пошук і дасягнуць максімальнага выніку ў справе ўвекавечання памяці, устанаўлення страчаных пасля вайны абеліскаў і аднаўлення пахаваных там воінаў, пошуку на месцах баёў новых, невядомых раней, пахаванняў абаронцаў Айчыны? Адназначны адказ даць тут складана, але агульныя рэкамендацыі можна прапанаваць. Існуючыя або зноў створаныя пошукавыя групы навучэнцаў вобласці пад кіраўніцтвам педагогаў у рамках праекта «Навучыся помніць» павінны адысці ад фармалізму ў выглядзе пустых прыгожых фотасправаздач і працаваць перш за ўсё на вынік. На расійскіх сайтах «Памяць народа», «Подзвіг народа» і «Мемарыял» размешчаны базы даных аб часцях і злучэннях, якія ўдзельнічалі ў баях 1941—1944 гадоў на дадзенай тэрыторыі, апісанне баёў, спісы беззваротных страт байцоў і камандзіраў, якія пахаваны ў кожнай канкрэтнай брацкай або адзіночнай магіле.

У аддзелах ідэалагічнай работы райвыканкамаў на кожную магілу ёсць пашпарт пахавання з прозвішчамі і колькасцю невядомых воінаў, якія там пахаваны. Параўноўваючы звесткі ў пашпартах са знойдзенымі прозвішчамі ў базах даных, мы ўстановім імёны воінаў, якія лічацца безыменнымі. Адным з асноўных крытэрыяў добрасумленнай работы пошукавай групы з'яўляецца колькасць устаноўленых імёнаў абаронцаў Айчыны, якія лічыліся прапаўшымі без вестак у гэтым пахаванні.

Для выяўлення невядомых ваенных магіл на грамадзянскіх могілках або ў наваколлях населенага пункта школьныя пошукавыя групы могуць у дні агульнай народнай памяці, такія як Радаўніца, Дзяды, сустрэцца са старажыламі — відавочцамі падзей вайны, якія прыязджаюць на сваю малую радзіму. Яны памятаюць месцы цяпер ужо безыменных пахаванняў. Гэта працуе, і пошукавікі часта паступаюць менавіта так.

МАЛАДЗЁЖНАЯ ПАЛІТЫКА

# ЗГУРТАВАЦЬ ДЗЕЛЯ АДЗІНАЙ МЭТЫ

## Да 80-годдзя Перамогі гродзенскія парламентарыі рыхтуюць першы абласны фестываль маладзёжных ініцыятыў

**НОВЫ праект праходзіць пад дэвізам «БТР: Будзем трымацца разам!» і з'яўляецца пляцоўкай для ўзаемадзеяння маладзёжных парламентаў, створаных пры мясцовых Саветах дэпутатаў Гродзенскай вобласці, аглядам–конкурсам іх творчых і грамадскіх дасягненняў.**





Па словах **старшыні Гродзенскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў Алены АНТОНАВАЙ,** асноўнымі мэтамі фестывалю з'яўляюцца развіццё і падтрымка патрыятычнай актыўнасці моладзі, уцягванне маладых грамадзян у грамадска-культурнае жыццё рэгіёна, пашырэнне магчымасцяў для самарэалізацыі. Праект скіраваны на тое, каб моладзь заявіла аб сабе як аб паўнавартасным партнёры ў рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі. Фестываль прысвечаны 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Знамянальная дата будзе адзначацца ў наступным, 2025 годзе.

— Пакуль складана спрагназаваць, якія менавіта ініцыятывы будуць прадстаўлены падчас конкурсу. Арганізатары конкурсу, а гэта Гродзенскі абласны Савет дэпутатаў і Асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў, гатовы разгледзець усе прапановы. Спадзяёмся, што прадстаўленыя ініцыятывы будуць актуальнымі і сацыяльна значнымі для той ці іншай мясцовасці. У далейшым менавіта мясцовая ўлада павінна дапамагчы маладым парламентарыям у рэалізацыі ідэй, — паведаміла Алена Антонава.

> «Трэба сказаць, што актыўнасць Маладзёжнага парламента Гродзенскай вобласці сёмага склікання відавочна ўзрасла. Вядзецца работа ў камісіях, члены парламента выходзяць з прапановамі, бяруць удзел у мясцовых і абласных мерапрыемствах, дэпутацкіх сесіях. «Творчая моладзь з дазволу гарадскіх улад выступае на гарадскіх пляцоўках. Сёння ідзе гаворка аб тым, каб мець такую маладзёжную пляцоўку для выступленняў у Гродне, як гэта ёсць у Брэсце. Магчыма, такі праект у далейшым будзе таксама рэалізаваны»

Такім чынам, заявіць аб сабе даецца магчымасць больш чым тысячы членам Маладзёжнага парламента Гродзенскай вобласці ва ўзросце ад 16 да 35 гадоў. Напачатку прапановы будуць разглядацца ў кожным раёне, затым пераможцы возьмуць удзел у фінальным этапе, дзе будуць вызначаны тры лідары. Магчыма, конкурсная камісія дадаткова ўнясе дапаўняльныя намінацыі, зазначыла старшыня абласной асацыяцыі. Мяркуецца, што вынікі праекта будуць разгледжаны напрыканцы лістапада.

Трэба сказаць, што ў Гродзенскай вобласці насельніцтва бярэ актыўны ўдзел у конкурсе грамадзянскіх ініцыятыў. Рэалізавана ці ў стадыі работы больш за два дзясяткі праектаў. Цяпер да гэтай дзейнасці далучаюцца і члены Маладзёжнага парламента Гродзенскай вобласці. На думку яго **старшыні Ягора СКЯПКО,** моладзь атрымае шанц не толькі заявіць аб сваіх здольнасцях, але і ўвасобіць у жыццё бізнес-планы.

Лідар Маладзёжнага парламента лічыць, што пэўная база ў рэалізацыі праектаў у гродзенцаў ужо ёсць. Значны вопыт напрацаваны ў адным з самых актуальных у сучасным жыцці моладзі кірунку — у медыйнай сферы. На яго думку, гэты аспект варта скіраваць у правільнае рэчышча.

Сам Ягор вучыцца па спецыяльнасці «журналіст» у ГрДУ імя Я. Купалы і працуе карэспандэнтам інтэрнэт-аддзела на гарадскім тэлебачанні, стварае інфармацыйныя пасты ў сацыяльных сетках. Менавіта яго медыйны праект атрымаў пераважную колькасць галасоў падчас выбараў старшыні Маладзёжнага парламента. Ягор і цяпер вядзе свой блог, у якім прадстаўлены навіны гарадскога жыцця.

— Мы здымаем ролікі ў кароткай і дынамічнай форме, імкнемся падаваць інфармацыйны кантэнт такім чынам, каб падключаць моладзь да грамадскай павесткі; паказаць, што і мы таксама можам арганізаваць штосьці; падключыцца да таго ці іншага мерапрыемства і заявіць аб сабе. Гаворка ідзе аб тым, каб аб'яднаць моладзь праз ініцыятывы, — упэўнены старшыня Маладзёжнага парламента.

> «Асноўнымі мэтамі фестывалю з'яўляюцца развіццё і падтрымка патрыятычнай актыўнасці моладзі, уцягванне маладых грамадзян у грамадска-культурнае жыццё рэгіёна, пашырэнне магчымасцяў для самарэалізацыі. Праект скіраваны на тое, каб моладзь заявіла аб сабе як аб паўнавартасным партнёры ў рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі. Фестываль прысвечаны 80-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Знамянальная дата будзе адзначацца ў наступным, 2025 годзе.

Ягор прыгадаў адзін з праектаў менавіта медыйнай сферы, падчас якога блогеры і журналісты на базе лагера правялі інтэнсіў па стварэнні маладзёжнага кантэнту. Такі вопыт, дарэчы, гатовы пераняць і расійскія калегі. Пагадненне паміж маладзёжнымі парламентамі Гродзенскай і Ніжагародскай абласцей у медыйнай сферы падпісана сёлета падчас трэцяга з'езда малых гарадоў у Расійскай Федэрацыі.

Трэба сказаць, што актыўнасць Маладзёжнага парламента Гродзенскай вобласці сёмага склікання відавочна ўзрасла. Вядзецца работа ў камісіях, члены парламента выходзяць з прапановамі, бяруць удзел у мясцовых і абласных мерапрыемствах, дэпутацкіх сесіях. «Творчая моладзь з дазволу гарадскіх улад выступае на гарадскіх пляцоўках. Сёння ідзе гаворка аб тым, каб мець такую маладзёжную пляцоўку для выступленняў у Гродне, як гэта ёсць у Брэсце. Магчыма, такі праект у далейшым будзе таксама рэалізаваны», — выказаў меркаванне субяседнік.

**Алена ПАСЮТА, старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў:**

— Абласны фестываль «БТР: Будзем трымацца разам» праходзіць напярэдадні 80-годдзя Вялікай Перамогі. Менавіта моладзь, якая павінна захоўваць спадчыну мінулых пакаленняў і будаваць будучыню незалежнай краіны, актыўна ўцягнута ў працэс падрыхтоўкі да знамянальнай даты. Думаю, што конкурс маладзёжных ініцыятыў выявіць сапраўдных актывістаў, якія не толькі раскрыюць свой творчы патэнцыял, але і прадэманструюць такія якасці, як уменне браць на сябе адказнасць, магчымасць згуртаваць вакол сябе маладых нераўнадушных людзей. Самыя актуальныя і значныя праекты, безумоўна, знойдуць падтрымку на ўзроўні абласнога і мясцовых Саветаў дэпутатаў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота з архіва Ягора СКЯПКО.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРНЫХ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 03.04.2004. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 10.785. Нумар падпісаны ў 19.30 12 лістапада 2024 года.

# АНІКЕЙЧЫК

## Словы пра скульптара Анатоля Анікейчыка



### НАЙЛЕПШАЕ

Калі з усёй сучаснай цывілізацыі выбраць найлепшага скульптара, дык Мікеланджэла не проста першы-найлепшы, ён наогул па-за канкурэнцыяй. Ён працаваў ажно ў трох стылях — адраджэнне, маньерызм і барока. Мікеланджэла менавіта ў скульптуры адкрыў, вынайшаў, стварыў стыль барока, апошні вялікі архітэктурны стыль, вынайдзены ў Італіі, бо наступны — ракако — нам падорыць Францыя. Беларусь падаравала свету ўзоры мадэрнізму ў Віцебскай школе, а потым сышла ў ціхі працоўны цень. Але і ў ценю жыве мастацтва, і ў ценю ёсць адкрыцці, мо яны і не маюць каштоўнасці для ўсяго шматаблічнага свету, але важныя для жыцця тутэйшага, штодзённага, каб не разрывалася повязь часоў. Для мяне важна, што ў Беларусі з'явіўся суровы стыль, што нашы мастакі, скульптары і музыкі плённа папрацавалі ў 60-я і 70-я гады мінулага стагоддзя. Яны стварылі трывалы грунт нашай незалежнасці і дзяржаўнасці. Сярод стваральнікаў суровага стылю быў і Анатоль Анікейчык — адзін з выдатных скульптараў у гісторыі беларускага мастацтва.

### АКАДЭМІЧНЫ МАЛЮНАК

У прафесійных мастакоў ёсць павага да ўмення дакладна маляваць. Калі нехта са студэнтаў зробіць акадэмічную пастаноўку на выдатна, пра гэта помніцца доўга. Валоданне малюнкам не дае аніякіх гарантый, што ты станеш заўважным мастаком, але яно забяспечвае заўсёдную павагу сярод прафесіяналаў. У нашым інстытуце маэстра Анікейчык, які ўзначальваў кафедру скульптуры, вельмі любіў так званых малявальшчыкаў. Ён прапаноўваў купіць акадэмічны малюнак у Толі Александровіча. Мэтр не проста пахваліў працу, не проста папрасіў падараваць, а прапанаваў яшчэ і грошы. У савецкія часы гэткая прапанова выглядала фантастычнай і ледзь не крымінальнай. Толя быў сарамлівы, асцярожны і таму пачаў аднеквацца. Тады сябар насварыўся на Толю за яго баязлівасць, і той занёс свой выдатны малюнак Анікейчыку. «Так, як ты, я ніколі не намалюю!» — сказаў тады Анікейчык Александровічу. Такія словы цяжка заслужыць, тым болей што сам Анікейчык выдатна валодаў акадэмічным малюнкам.

### АКІЯН

Ад пыхлівых галерэйшчыц можна пачуць: «У Беларусі няма скульптуры». Так і ў самазаканых арт-крытыкаў не-не, дый прачытаеш: «У Беларусі няма кіно». Хапае ў нас самаедства, самадурства і самапрыніжэння. Але мы ёсць. У нас ёсць Янка Купала. У нас быў, ёсць і будзе Уладзімір Караткевіч. Мо ў нас яшчэ не склалася ў значную з'яву кіно, але ў нас ёсць таленавітыя акцёры, сцэнарысты і кінарэжысёры. Новая беларуская скульптура пакрысе назапашвае адметнасцяў, знаходак, вобразаў, і раней ці пазней яна складзецца ў з'яву. Веру ў гэта. У нас ёсць яркія асобы сярод скульптараў, той жа Анатоль Анікейчык, які змог зрабіць некалькі помнікаў Купалу, і адзін з іх устанавіць за акіянам, у штаце Нью-Ёрк.

### ЗВЫШЧАЛАВЕК

У альманаху «Панорама искусств 3» першым матэрыялам стаіць артыкул спадарыні Кірылавай пра скульптара Анатоля Анікейчыка. У тэксце цалкам кампліментарным, пафасным і хвалебным можна знайсці згадку пра звышчалавека: «Его герой, этот, казалось бы, сверхчеловек, был задуман скульптором в первую очередь как просто человек, наделённый запоминающимся характером, могущество которого — в его нравственной силе». Дзіўнай падаецца згадка пра маральную моц простага чалавека, калі той сціскае ў руцэ аўтамат. Зрэшты, будзьма праўдзівымі, звышчалавеку аўтамат не патрэбны, ён і без аўтамата з самай звычайнай кавенькай усіх пераможа. Каб пераканацца ў маіх словах, можна не ездзіць да манумента «Прарыў» і не разглядаць там аўтаматчыка, дастаткова сходзіць у сквер Янкі Купалы і палюбавацца постаццю песняра Янкі з кавенькай. Постаць Купалы, адлітая з бронзы Анікейчыкам, такая вялізная, што ў нейкі момант можна падумаць: скульптар паставіў у мінскім сквэры звышчалавека. Такая думка памылковая, і яе памылковасць лёгка даказваецца. Калі ў цёмны і глухі час наблізіцца да бронзавага Купалы і стукнуць па ім кулаком, дык можна пачуць гулкую пустату ў сярэдзіне скульптуры. Бронзавая постаць у сярэдзіне пустая. Менавіта гэтая пустата і не дае скульптуры стаць звышскульптурай і ўвасабляць сабою звышчалавека. Такое адкрыццё я зрабіў разам з паэтам Анатолем Сысам. Мы пастукалі па бронзавай постаці Купалы і слухалі гудзенне пустаты. Так можна ў Мінску дастукацца і да нябёсаў.

### АПОШНЯЕ СЛОВА

Анатоль Анікейчык у апошні дзень свайго жыцця з'ездзіў у аэрапорт. Ён прывёз у горад сябрука — Гаўрылу Вашчанку. Так сябры дамовіліся, калі Вашчанка вернецца з замежнай камандзіроўкі, Анікейчык яго сустрэне сваім легкавічку. Пасля паездкі ў аэрапорт Анатоль адчуў моцную стому, вырашыў пайсці дамоў і якую гадзінку паляжаць на канапе. Так і зрабіў. Старэнькая Анатолева маці ўзялася паправіць падушку пад сынавай галавой. Анатоль прыўстаў, узняў рукі і сабраўся быў сказаць, што ў яго ўсё нармальна і не трэба хвалявацца, але змог вымавіць толькі адно слова. «Мама!» — выдыхнуў з сябе Анатоль Анікейчык і памёр.

**Толькі тая скульптура сапраўдная, да якой хочацца дакрануцца і праверыць — а раптам жывая? У дзяцінстве мне карцела дакрануцца да драўляных скульптур Сяргея Канёнкава, што ўпрыгожваюць залы ў Мастацкім музеі. Падавалася, што ад тых скульптур сыходзіць цяпло. У Парыжы каля Луўра я дакрануўся да Флоры, вылепленай Арыстыдам Маёлем. У сонечны майскі дзень Флора была па-чалавечы цёплая і ветлівая. У Мінску я напісаў казку пра дакрананні да носа Леніна, зробленага Анатолем Анікейчыкам для станцыі метро.**



### КАНЬЯК

Скульптар Анатоль Анікейчык частаваў мяне каньяком і шакаладкай. У майстэрню да Анікейчыка я прыйшоў, каб напісаць пра яго дзяцінства ў часопіс «Беларусь». Анатоль Аляксандравіч расказаў цудоўную гісторыю пра металічную клямку, якая стаяла на дашчаных весніцах у Барысаве. Хлопчык Толя ўзяўся рукою за нагрэтую летнім сонцам клямку і адчуў сваё пакліканне — рабіць рэчы з металу. Тады барысаўскі хлопчык яшчэ не ведаў, што стане аўтарам шматметровых бронзавых помнікаў, але ад тых весніцаў з жалезнай клямкай пачаўся яго шлях у выдатныя майстры... Мы пілі каньяк маленечкімі чарачкамі, бо Анатоль Анікейчык успрымаў гэты духмяны напой як каштоўныя лекі. Гэта была мая апошняя сустрэча і размова з аўтарам найлепшых помнікаў, якія беларускі народ паставіў свайму прароку — паэту Янку Купалу. Калі Анікейчык памёр, сябры казалі, што ён проста не паспеў выпіць маленечую чарку каньяку, каб расшырыць сасуды. Вядома, я сумняваюся, што каньяк выратаваў бы мастака, але ж сябрам хацелася верыць у чароўную сілу напою. Яны пілі каньяк за жалобным сталом і верылі, а я згадваў маленькага хлопчыка каля весніцаў у горадзе Барысаве. Згадваў, як ён бярэцца рукою за клямку і пачынае доўгае падарожжа ў творчасць.

### СТУДЭНТЫ

Толькі тая скульптура сапраўдная, да якой хочацца дакрануцца і праверыць — а раптам жывая? У дзяцінстве мне карцела дакрануцца да драўляных скульптур Сяргея Канёнкава, што ўпрыгожваюць залы ў Мастацкім музеі. Падавалася, што ад тых скульптур сыходзіць цяпло. У Парыжы каля Луўра я дакрануўся да Флоры, вылепленай Арыстыдам Маёлем. У сонечны майскі дзень Флора была па-чалавечы цёплая і ветлівая. У Мінску я напісаў казку пра дакрананні да носа Леніна, зробленага Анатолем Анікейчыкам для станцыі метро. Абазнаныя ў мінскіх легендах людзі расказалі мне пра студэнтаў універсітэта, якія дакранаюцца да бронзавага Леніна, бо ён дапамагае ім здаць іспыты. Ад тых дакрананняў бронзавы нос цяпер ззяе так, нібыта ён залаты. Анатоль Анікейчык быў выдатным выкладчыкам, ён з павагай і разуменнем ставіўся нават да праблемных і нараўістых студэнтаў. Каб ён цяпер пабачыў залаты нос свайго Леніна і пачуў гісторыю пра дапамогу на іспытах, дык, напэўна, пасмяяўся б і парадаваўся б за свайго Леніна і жвавых студэнтаў.

### УЗНАГАРОДА

Анатоль Анікейчык любіў жартаваць і жартаваў ён шырока. Запамінальны жарт выйшаў на святкаванні пяцідзесяцігоддзя манументаліста Уладзіміра Іванавіча Стальмашонка... У той час вялікую папулярнасць мела кінастужка «Афіцэры». Тых афіцэраў ігралі кіназоркі — Юматаў і Ланавой. Героя грамадзянскай вайны, ролю якога выконваў Юматаў, начальства ўзнагародзіла чырвонымі шараварамі. Кінастужка была чорна-белай, таму размовы пра чырвоныя шаравары ўражвалі і запаміналіся. На дзень народзін Стальмашонка Анатоль Аляксандравіч Анікейчык прыйшоў з вялікім пакетам, ён згадаў фільм «Афіцэры», прыгадаў тыя чырвоныя шаравары, разгарнуў пакет і ўзнагародзіў манументаліста Стальмашонка шаўковай ватнай чырвонай коўдрай.

### ЧОРНЫ АТЛЕТ

У мінскім парку імя Чалюскінцаў жыло шмат самых розных скульптур: алені, танцоры з баянам, дзяўчаткі-выдатніцы з кнігамі. У святочныя сонечныя дні народ фатаграфаваўся каля гэтых скульптур, збольшага фатаграфаваў дзятву. Сярод тамтэйшых скульптур я меў любімца — чорнага атлета на высокім пастаменце. Ён шырока раскінуў рукі і на правай далоні трымаў кавалак паўкаштоўнага каменя — слюды. У парк я хадзіў займацца спортам, фігурным катаннем і акрабатыкай, пэўна, таму мне і падабаўся малады атлет. Знаёмыя скульптары казалі, што гэта дыпломная праца скульптара Анатоля Анікейчыка і называецца яна «Данка». Я так і думаў, але цяпер прачытаў, што дыплом Анікейчыка называўся «Мантажнікі». Пэўна, гэта быў адзін з варыянтаў дыпломных праектаў Анікейчыка, які дарабляўся і ставіўся пазней. Згадваю я чорнага атлета, бо ў Мінску быў чорны дзень для скульптуры. Больш за восемдзесят аб'ектаў вулічнай скульптуры былі прызнаныя антымастацкімі, і напярэдадні алімпіяды ў 1980 годзе іх дэмантавалі і павывозілі на сметнік. Тады з парка Чалюскінцаў звезлі і майго любімага чорнага атлета разам з аленямі і танцорамі. Ці стаў наш Мінск лепшым, калі страціў столькі скульптуры? Думаю, не стаў; больш за тое, некаторых аленяў варта было б і аднавіць, каб у святочныя дні побач з імі зноў фатаграфаваліся б дзеці, а разам з аленямі можна было б аднавіць і атлета, зробленага некалі маладым Анатолем Анікейчыкам.

Адам ГЛОБУС.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | БИП-Университет права и социально-информационных технологий, г. Минск, ул. Короля, дом 3 |

**Предмет электронных торгов – бывшее в употреблении оборудование. Местонахождение: г. Минск, 2-й пер. Путепроводный, д. 1**

| № лота | Наименование | Начальная цена, с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|
| 1 | **Листоподборочная машина,** 2004 г. в., инв. № 200704 | **5 299,44** |
| 2 | **Нож для резака IDEAL 4705, резак гильотинного типа IDEAL 4705+станина IDEAL 4700/4705,** 2021 г. в., инв. № 200421 | **7 280,02** |
| 3 | **Переплетная машина ATLAS 190, 2018** г. в., инв. № 150318 | **1 327,46** |
| 4 | **Фальцовщик СФ345,** 2004 г. в., инв. № 200704 | **1 558,68** |
| 5 | **Брошюровщик Rexel CB 290,** 2011 г. в., инв. № 040511, **скобы для степлера** «Raion» 23/8 1000/уп, (10х100), инв. № 291221, **скобы для степлера** «Raion» NO 26/6 1000/уп, инв. № 150120 | **301,03** |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях на счет BY92BELB 30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 15 (пятнадцать) рабочих дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **от 8 до 10 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 22.10.2024 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 13.12.2024 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **12.12.2024 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Контактные данные:** **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона, оператор ЭТП** | ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33, помещение 339. Адрес ЭТП: **www.torgi24.by** |
| **Продавец** | Сафронов Андрей Валерьевич |

**Предмет электронных торгов:**

| Лот | Наименование (назначение), инвентарный номер | Начальная цена без НДС (доллар США) |
|---|---|---|
| 1036 | Капитальное строение с инвентарным номером 600/С-135318, расположенное по адресу: Минская область, Минский район, Самохваловичский с/с, аг. Самохваловичи, пер. Жемчужный, 4, площадью – 161,4 кв. м, назначение – здание одноквартирного жилого дома, наименование – жилой дом (земельный участок с кадастровым номером 623686303601000074, площадь – 0,1549 га, целевое назначение – строительство и обслуживание жилого дома) | 133 500,00 $ |

**расположенный по адресу:** Минская обл., Минский р-н, Самохваловичский с/с, аг. Самохваловичи, пер. Жемчужный, 4

**Размер шага** составляет **5 %** от начальной цены лота

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793, получатель: ООО «Расантехторг»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять)** рабочих дней после электронных торгов

**Имеющиеся обременения в отношении имущества:** имущество находится в залоге у ОАО «Банк БелВЭБ» на основании договора об ипотеке № 03220407 от 12.05.2022 г. Зарегистрированы два человека

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **2 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: по лоту (для каждого лота) – **не более 500,00 бел. руб.**

**Дата и время начала торгов: 12.12.2024 г.** в 11.00.
**Дата и время окончания торгов: 12.12.2024 г.** в 16.00.

Для участия в торгах, необходимо подать заявку и пройти регистрацию в качестве участника торгов на торговой площадке: **www.torgi24.by.** Прием документов на участие в торгах осуществляется организатором торгов ООО «Расантехторг» на электронную почту: **info@torgi24.by.** Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – **с 13.11.2024 по 09.12.2024** с 9.00 до 17.00

**Контактные данные: +375 (29) 607-79-50; +375 (29) 607-22-87. E-mail: info@torgi24.by**

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания
- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Банк БелВЭБ», 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 29. |

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

**Первые повторные публичные торги (аукцион). Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 21.09.2024 г. в газете «Звязда» № 185 (30319), стр. 10**

| Лот № | Наименование | Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС | Минимальная цена, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инв. № 130/С-3406, общ. пл. 0 кв. м, Пинский район, Логишинский с/с, г. п. Логишин, ул. Сёмина, д. 24 | 10 440,00 | 6 264,00 |
| 2 | Капитальное строение с инв. № 130/С-4689, общ. пл. 0 кв. м, Пинский район, Логишинский с/с, г. п. Логишин, ул. Сёмина, д. 24 | 1 640,00 | 984,00 |

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг электронных торгов** – 5 % от начальной цены лота.
В случае отсутствия ставок участников торгов начальная цена торгов поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками торгов

**Информация об имуществе, входящем в состав лота,** условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций - Торги»: https://iintorgi.by

**Срок подписания договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) рабочих дней** после публичных торгов (аукциона)

**Условия оплаты предмета электронных торгов: не позднее 10 (десяти) рабочих дней** со дня заключения договора купли-продажи. Переход права собственности – после полной оплаты Имущества

**Торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги», размещенным по адресу: https://iintorgi.by**

Победитель публичных торгов (аукциона), либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить аукционисту торгов вознаграждение в размере **0,7 % от цены продажи лота, но не менее 200,00 бел. руб. в течение 3 (трех) рабочих дней** после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона):** 22.11.2024 г., начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Заявки на участие в публичных торгах (аукционе) принимаются **по 21.11.2024 г. до 17.00**

**Контактные данные:** **Тел: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by**

## ООО «Юридическая компания Аспект» проводит вторые повторные публичные торги в форме открытого аукциона по продаже имущественных прав ликвидируемого юридического лица – иностранного унитарного предприятия «Юколанефть»

| № п/п | Наименование лота | Начальная цена без НДС*, руб. | Шаг торгов (5 %), руб. | Задаток для участия в торгах (10 %), руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Дебиторская задолженность, подлежащая взысканию с ООО «АРСнефть» (УНП 291047728) на общую сумму 39 876,99 бел. руб. | 28 711,43 | 1 435,57 | 2 871,14 |
| 2 | Дебиторская задолженность, подлежащая взысканию с ООО «Фолоуми» (УНП 193120458) на общую сумму 2 745,88 бел. руб. | 1 977,03 | 98,85 | 197,70 |

*Торги назначены на* ***28.11.2024 г.*** *в* ***10.30*** *по адресу:* ***г. Минск, ул. Тимирязева, д. 65, оф. 401, холл (4 этаж).*** *Срок приема заявок, внесения задатка для участия в торгах – до* ***26.11.2024 г.*** *включительно. Заявки принимаются организатором торгов по месту проведения торгов в рабочие дни с 9.00 до 17.30 (по пятницам – до 16.30)*

| | |
|---|---|
| **Продавец** | **Иностранное унитарное предприятие «Юколанефть»** |
| **Организатор торгов** | **ООО «Юридическая компания Аспект»** |
| **Реквизиты для оплаты задатка** | **Иностранное унитарное предприятие «Юколанефть»** р/с BY23TECN30121503000130000000 в ОАО «ТЕХНОБАНК», г. Минск, БИК TECNBY22, УНП 192140296 |

Условия проведения торгов размещены на сайте ООО «Юридическая компания Аспект» – «aspekt-avs.by» в разделе «Актуальные аукционы. Лоты на реализации. Дебиторская задолженность» по ссылке «https://aspekt-avs.by/aykciony_info/»
** Окончательная цена лота включает НДС по ставке 20 %*

Объявление о предыдущих торгах опубликовано в газете «Звязда» 27.08.2024 (стр. 6), 22.10.2024 (стр. 14)

Дополнительная информация о порядке проведения торгов по телефону +375 (44) 5986627 в рабочие дни с 9.00 до 17.30 (по пятницам – до 16.30). Ознакомление с документами на лот возможно по месту проведения торгов после предварительного согласования по тел. +375 (44) 5986627

## Результаты проведения рекламной игры «ПАЧКА НА ПРОКАЧКУ»

**Организатор рекламной игры** – ООО «Оджей групп», УНП 192479466, зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 20.05.2015 года № 294 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей. Регистрационный номер 192479466.

**Местонахождение организатора:** г. Минск, пр-т Машерова, д. 15, корп. 1, каб. 2, Республика Беларусь.

**Сведения о государственной регистрации рекламной игры:** Свидетельство о государственной регистрации № 4446 от 12.07.2024 г., выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

**Территория проведения рекламной игры:** Республика Беларусь.

**Срок проведения рекламной игры:** с 01.08.2024 г. по 16.11.2024 г. (включая период розыгрыша и вручения призов).

**Место и дата проведения розыгрышей:** г. Минск, пр-т Машерова, д. 15, кор. 1, каб. № 2, этаж 2.

| Розыгрыш | Дата розыгрыша |
|---|---|
| 1 | 12.08.2024 г. |
| 2 | 19.08.2024 г. |
| 3 | 26.08.2024 г. |
| 4 | 02.09.2024 г. |
| 5 | 09.09.2024 г. |
| 6 | 16.09.2024 г. |
| 7 | 16.09.2024 г. |

**Количество человек, принимавших участие в розыгрыше:** 3 168 (три тысячи сто шестьдесят восемь) человек.

**В рекламной игре был разыгран следующий призовой фонд:**

**«Приз 1»** в количестве 6 шт.: велосипед Racer Matrix 27.5 18 серый, бронзовый металлик 2024, стоимостью 954,00 руб. + денежные средства в размере 111,47 руб.

**«Приз 2»** в количестве 6 шт.: электросамокат MyWay X5 (графитовый), стоимостью 1080,00 руб. + денежные средства в размере 130,30 руб.

**«Приз 3»** в количестве 6 шт.: рюкзак для ноутбука Thule Aion 28L, коричневый, 3204722, стоимостью 501,60 руб. + денежные средства в размере 43,87 руб.

**«Приз 4»** в количестве 10 317 шт.: набор из многоразовых бамбуковых трубочек д/питья со щеткой, стоимостью 7,80 руб.

**«Суперприз»** в количестве 1 шт.: электромобиль BYD Yuan Plus Flagship в комплектации в соответствии со спецификацией, емкость батареи (кВт/ч): 60,5, цвет: серый, куз. №: LC0CE4CB3P4210815, год выпуска: 2023, страна происхождения: Китай, стоимостью 94 185,00 руб. + денежные средства в размере 14 042,54 руб.

Призовой фонд рекламной игры разыгран не полностью.

Общая стоимость разыгранного призового фонда составляет 205 627,58 (двести пять тысяч шестьсот двадцать семь) белорусских рублей 58 копеек.

Общая стоимость не разыгранного призового фонда составляет 75 527,40 (семьдесят пять тысяч пятьсот двадцать семь) белорусских рублей 40 копеек.

Официальные результаты розыгрыша призов и полный список победителей размещены на сайте: www.promo.repacklays.by

Правила рекламной игры были опубликованы в выпуске газеты «Звязда» от 30.07.2024 г.

Телефон для справок: **+375 29 624 40 80,** с 10.00 до 20.00 в будние и выходные дни, без обеда.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона/ оператор** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. УНП 191224638. www.ipmtorgi.by |
| **Продавец** | ООО «БИП-С Плюс», г. Минск, ул. Короля, дом 3, к. 41в. УНП 190575262 |

**Предмет электронных торгов:**

**Административно-хозяйственное помещение** (административное помещение), инв. № 160/D-9672, общ. пл. 692,9 м$^2$, по адресу: ***Брестская обл., г. Пружаны, ул. Октябрьская, д. 104-1***

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 80 000,00 долл. США***

**Примечание: цена продажи Предмета электронных торгов фиксируется в протоколе о результатах электронных торгов в сумме в белорусских рублях, эквивалентной цене продажи лота в долларах США по курсу НБРБ на дату проведения электронных торгов*

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов перечисляется в белорусских рублях (BYN) по курсу Национального банка Республики Беларусь на день оплаты на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000; получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»; УНП 191224638

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней** со дня завершения электронных торгов

**Срок оплаты предмета электронных торгов: 15 (пятнадцать) рабочих дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **4 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 22.10.2024 г.

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 27.11.2024 г. с 11.00 до 13.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:**
заявки на участие в электронных торгах принимаются по **26.11.2024 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

**Контактные данные:** **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by**

# З дапамогай робатаў, малекулярна-генетычных даследаванняў і ізатопных тэхналогій

## Сучасныя методыкі садзейнічаюць павелічэнню выжывальнасці пацыентаў пры раку






**Штогод у Беларусі выяўляюць амаль 60 тысяч новых выпадкаў захворвання на рак. Захваральнасць паступова расце, і гэтая тэндэнцыя характэрна для многіх краін свету. Пры гэтым смяротнасць амаль не павялічваецца, што сведчыць аб добрых выніках лячэння. У прыватнасці, пяцігадовы парог выжывальнасці пераадольвае каля 80 % пацыентаў, якія былі пралечаны па радыкальнай праграме. А ў апошнія гады такое лячэнне стала магчымым не толькі для хворых з першай, другой і трэцяй стадыямі, а часам нават і з чацвёртай. Пра вынікі лячэння, прымяненне новых тэхналогій і планы на новае будаўніцтва расказалі ў РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава.**

### Розніцы паміж гараджанамі і вяскоўцамі ў выяўленні няма

Як адзначыў **дырэктар РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава Сяргей ПАЛЯКОЎ**, за апошнія 20 гадоў адзначаецца рост колькасці нававыяўленых выпадкаў злаякасных наватвораў. Калі ў 2019 годзе выяўлены 54 961 новы выпадак, то ў 2023-м — 57 045.

— Паступова мы набліжаемся да 60 тысяч нававыяўленых пацыентаў штогод. Гэта, вядома, дастаткова шмат, але сведчыць і аб тым, што ранняя дыягностыка і ўвогуле дыягностыка ў нашай краіне пастаўлена на дастаткова высокі ўзровень, — сказаў Сяргей Палякоў. — Дыягностыкай займаецца пярвічнае звяно, а мы атрымліваем той вынік, які выяўляюць нашы калегі і займаемся лячэннем.

Розніца ў выяўленні злаякасных наватвораў у гарадскога і сельскага насельніцтва невялікая і цяпер звялася да мінімуму. Сярод вяскоўцаў колькасць выпадкаў раку складае 617 на 100 тысяч насельніцтва, сярод гараджан — 629.

— Гэта сведчыць пра тое, што выяўленне злаякасных наватвораў і дапамога як сярод гарадскога, так і сярод сельскага насельніцтва ў нашай краіне аднолькавыя, гэта надзвычайны паказчык, — пракаментаваў Сяргей Палякоў.

РНПЦ курыруе і Мінскую вобласць, таму кожны тыдзень спецыялісты выязджаюць у нейкі раён, дзе аказваюць кансультатыўную і арганізацыйную дапамогу. Тое ж самае адбываецца ва ўсіх астатніх абласцях. Спецыялісты РНПЦ выязджаюць таксама ў абласныя цэнтры, гарады, дзе размяшчаюцца міжраённыя дыспансеры.

У Беларусі, у адрозненне ад некаторых іншых краін СНД, захавана сістэма дапамогі, пры якой лячэнне пацыентаў са злаякаснымі пухлінамі адбываецца ў спецыялізаваных установах — анкалагічных дыспансерах. Усе пацыентыназіраюцца ў іх, першыя тры гады пасля выяўлення захворвання кантралююцца ў анкалагічных паліклініках пры дыспансерах, пры наяўнасці рэцыдыву іх накіроўваюць у клінічную сетку.

Усе пацыенты ці РНПЦ, ці міжраённага анкалагічнага дыспансера дыягнастуюцца і лечацца па агульных алгарытмах, якія афармляюцца загадам Міністэрства аховы здароўя і дзейнічаюць для ўсёй краіны.

— Мы стараемся ўпісаць туды мінімальныя сацыяльныя стандарты, якія дапамагаюць вытрымліваць аднолькавыя пратаколы лячэння. Любы пацыент незалежна ад таго, дзе будзе знаходзіцца, павінен атрымаць дапамогу ў адпаведнасці з гэтымі стандартамі, — паведаміў Сяргей Палякоў.

Даныя аб пацыентах знаходзяцца ў канцрэгістры, які быў створаны яшчэ ў 70-я гады мінулага стагоддзя і з'яўляецца адным з самых унікальных канцрэгістраў не толькі на постсавецкай прасторы, але і ў свеце.

— Мы маем інфармацыю пра ўсіх анкалагічных пацыентаў, ведаем вынікі лячэння, выжывальнасць, можам іх аналізаваць, прасачыць усіх пацыентаў. Канцрэгістр пастаянна развіваецца, у яго ўкладаецца пэўнае фінансаванне. У шэрагу выпадкаў некаторыя фармкампаніі нават гатовы дапамагаць нам з фінансаваннем, каб там з'яўляліся новыя главы і мы маглі атрымліваць больш інфармацыі пра нашых пацыентаў і мець яе ў гістарычнай перспектыве, — расказаў Сяргей Палякоў.

### Лячэнне па трох кірунках

Згодна са статыстыкай, у мужчын самы распаўсюджаны від раку — рак прастаты, у жанчын — рак малочнай залозы.

— Гэта тэндэнцыя агульнасусветная, і гэта тыя паталогіі, на якія мы ў першую чаргу звяртаем увагу, займаючыся ранняй дыягностыкай, скрынінгам, дыспансерызацыяй нашага насельніцтва, — сказаў дырэктар РНПЦ. — На другім месцы ва ўсіх — колаpэктальны рак (рак тоўстай кішкі). Гэта праблема, важная для абаіх полаў. Выкананне ранніх каланаскапій, выяўленне калу на схаваную кроў — тыя моманты, на якія мы заўсёды звярталі ўвагу для ранняга выяўлення гэтай паталогіі.

Нягледзячы на рост захваральнасці, смяротнасць практычна не змяняецца.

— Вядома, хацелася б зніжаць яе, але ў тых, хто захварэў, не заўсёды ранні я формы. На жаль, бываюць і запушчаныя, — адзначыў Сяргей Палякоў.

Лячэнне анкалагічных пацыентаў вядзецца па трох кірунках. Першы — аперацыя. Ва ўсіх анкалагічных установах краіны за мінулы год праведзена каля 87 тысяч хірургічных умяшанняў — і стацыянарных, і амбулаторных. У РНПЦ штогод выконваецца не менш чым 10 тысяч аперацый, і паступова гэта лічба расце.

— Аперацыйная ў нас сучасная, маецца ўсё абсталяванне, у тым ліку лапараскапічнае, эндаскапічнае. Пакуль у нас няма робататэхнікі, але, паколькі цяпер паявіліся канкурэнты ў амерыканскіх апаратаў з Паўднёвай Карэі і Кітая, ідзе конкурс, я мяркую, што ў найбліжэйшы час у нашым цэнтры і ў іншых з'явіцца відэасістэмнае рабатызаванае абсталяванне, якое дапаможа з удасканаленнем малаінвазіўнай хірургіі. Па складанасці яна не ўступае адкрытым хірургічным аперацыям, якія шырока распаўсюджаны ў анкалогіі, — расказаў кіраўнік РНПЦ.

Далей пацыенту патрабуецца прамянёвая хірургія. Анкалагічныя дыспансеры надзвычайна аснашчаны адпаведным абсталяваннем, і вылучаецца тут Мінскі гарадскі анкалагічны цэнтр. Ён мае шэсць лінейных паскаральнікаў — унікальны выпадак, калі ў адным цэнтры сканцэнтравана такая колькасць складанага абсталявання. У РНПЦ, акрамя лінейных паскаральнікаў і брахітэрапеўтычных комплексаў для мясцовай тэрапіі, выкарыстоўваюць гаматэрапеўтычны апарат. Ён належыць да другога пакалення, і гэта найбольш дасканалая тэхніка для правядзення прамянёвай тэрапіі на галаўным мозгу. З дапамогай апарату, напрыклад, удалося аперніць больш чым 100 метастазаў у аднаго з пацыентаў, дзякуючы гэтаму яму захавалі жыццё.

Акрамя трох тамографаў у РНПЦ маецца цыклатрон — устройства, што дазваляе на месцы гатаваць дыягнастычныя ізатопы, якія дапамагаюць выявіць схаваныя пухлінныя пашкоджанні ў арганізме.

— Мы развіваем гэты кірунак і маем перспектыўныя планы. Падключаецца «Расатам», і мы хацелі б пашыраць магчымасці тэрапіі з выкарыстаннем ізатопаў. Спадзяемся, што ў бліжэйшай будучыні будзе магчымасць развіваць не толькі ПЭТ-цэнтр, але і ізатопныя тэхналогіі ў лячэнні пацыентаў, — падзяліўся Сяргей Палякоў.

Малекулярна-генетычная лабараторыя пры РНПЦ дазваляе выконваць амаль увесь спектр малекулярна-генетычных даследаванняў, якія дапамагаюць ставіць дыягназ і персаніфікавана падыходзіць да лячэння пацыентаў з рознымі відамі злаякасных пухлін.

Трэці важны кірунак у лячэнні — хіміятэрапія. Больш за 50 % лекавых сродкаў, якія выкарыстоўваюць медыкі, выпушчаны ў Беларусі.

— Гэта джэнерыкі дастаткова добрай якасці пасля сур'ёзных клінічных выпрабаванняў. Трэба сказаць, што цэнтр экспертызы, які працуе ў нашай краіне, вельмі пільна падыходзіць да рэгістрацыі лекавых прэпаратаў, і мы са стопрацэнтнай упэўненасцю даверуем тым сродкам, якія выпускаюцца ў нашай краіне, і смела можам заяўляць, што яны не горш за арыгінальныя прэпараты, што прымяняюцца для лячэння злаякасных пухлін. Цяпер нашай фармпрамысловасцю выпускаюцца і таргетныя сродкі, — расказаў кіраўнік РНПЦ.

Лячэнне дае сапраўды добрыя вынікі: звыш 80 % пацыентаў, якія атрымалі лячэнне па радыкальнай праграме, жывуць больш за пяць гадоў.

— Мы адназначна можам ганарыцца нашым вынікамі. Пяцігадовая выжывальнасць — той крытэрый, па якім ацэньваюць нашу працу як анкалагаў па ўсёй краіне. Гэта крытэрый, на падставе якога мы можам казаць, ці дасягнулі мы нейкіх вынікаў, і можам параўноўваць сябе з еўрапейскімі, агульнасусветнымі паказчыкамі, — сказаў Сяргей Палякоў.

РНПЦ увесь час працуе над удасканаленнем лячэбных працэсаў і ўкараненнем новых тэхналогій. Пастаянная навуковая работа праводзіцца ў цэнтры для таго, каб палепшыць вынікі лячэння. За апошнія дзесяць гадоў на 10 % павялічылася колькасць тых, хто перасягнуў пяцігадовы парог выжывальнасці сярод пацыентаў, пралечаных па радыкальнай праграме. І гэта не толькі пацыенты першай, другой або трэцяй стадыі, але і пацыенты з чацвёртай стадыяй, якая лічыцца запушчанай. Яны таксама ў шэрагу выпадкаў атрымліваюць лячэнне па радыкальнай праграме. Дарэчы, за апошнія 20 гадоў практычна напалову палепшыліся вынікі ў лячэнні пацыентаў з чацвёртай стадыяй, што таксама вельмі добры паказчык.

Каля 60 % пацыентаў, якія сталі на ўліку на канец 2023-га, знаходзяцца на ім пяць і больш гадоў.

— Мы лічым гэтых пацыентаў вылечанымі. Крытэрый пяцігадовай выжывальнасці ва ўсім свеце сведчыць аб эфектыўнасці дапамогі анкалагічным пацыентам, і ў нашай краіне ён даволі значны, — падкрэсліў дырэктар РНПЦ.

### Цэнтр ядзернай медыцыны і новы хірургічны корпус

Кожны год у РНПЦ праходзіць лячэнне каля дзвюх тысяч замежных грамадзян. Дастаткова вялікі паток пацыентаў з Расійскай Федэрацыі, рэспублік Сярэдняй Азіі. Ёсць пацыенты з далёкага замежжа, а таксама з Польшчы, Літвы і Латвіі.

Для зручнасці беларускіх і замежных пацыентаў на базе РНПЦ функцыянуе пансіянат. У ім можа спыніцца як хворы, які прыехаў на працэдуры, так і сям'я, якая вырашыла яго падтрымаць. Таксама ў РНПЦ перыядычна прыязджаюць спецыялісты з рэгіёнаў на разнастайныя канферэнцыі. І такі фармат размяшчэння для іх таксама зручны.

У планах у РНПЦ стварыць Цэнтр ядзернай медыцыны сумесна з расійскім «Расатамам».

— У нас апошні год завязалася даволі цеснае супрацоўніцтва з кампаніяй «Расатам», якая пераарыентавала сябе на мірныя тэхналогіі. У Расійскай Федэрацыі вельмі актыўна развіваюцца магчымасці выкарыстання радыеізатопаў не толькі для дыягностыкі, але і для лячэння. У гэтым кірунку «Расатам» зрабіў нам прапанову, якая цяпер актыўна абмяркоўваецца. У нас ёсць пэўныя планы па будаўніцтве Цэнтра ядзернай медыцыны, які можа задаволіць усе нашы патрэбы і ў дыягностыцы, у вырабе ізатопаў, і развіць новыя лячэбныя тэхналогіі, — расказаў дырэктар РНПЦ.

Пакуль што стварэнне цэнтра знаходзіцца ў стадыі планавання і падрыхтоўкі матэрыялаў. У далейшым яны будуць прадстаўлены ў Міністэрства аховы здароўя і ва Ўрад.

Сярод планаў таксама ўкараненне рабатычнай хірургіі. Большая частка аперацый у РНПЦ — лапараскапічныя. Гэта дапамагае спрасціць аднаўленне пацыентаў і палепшыць якасць іх жыцця.

— Рабатычная тэхніка — гэта больш дасканалая лапараскапічная тэхналогія. Па сутнасці, тут мы проста выкарыстоўваем маніпулятары. Для хірурга там значна лепш візуалізацыя. Усё паказваецца ў 3D у адрозненні ад лапараскапіі з плоскім экранам. Рабатычная тэхніка таксама дазваляе ў шэрагу выпадкаў палепшыць вынікі лячэння менавіта ў плане якасці жыцця пацыентаў, — адзначыў дырэктар.

Акрамя таго, у РНПЦ плануецца будаўніцтва новага хірургічнага корпуса, абнаўленне парка абсталявання для прамянёвай тэрапіі, умацаванне дыягнастычнай базы дыспансераў.

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ
юридическая компания

- Взыскание задолженности
- Проведение торгов
- Ликвидация
- Юридические услуги

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н. Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ОАО «Беларусьрезинотехника», УНП 700069297, 213829, Могилевская область, г. Бобруйск, ул. Минская, д. 102 |

**Пятые повторные публичные торги (аукцион) в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по делу № 15-11/Б/2019 в экономическом суде Могилевской области. Ранее опубликованное извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) опубликовано 16.10.2024 г. в газете «Звязда» № 202 (30336), стр. 15**

| | Предмет публичных торгов (аукциона) | Начальная цена, бел. руб. с учетом НДС | Минимальная цена, бел. руб. с учетом НДС |
|---|---|---|---|
| 1 | Автомобильный прицеп-цистерна б/у, вместимостью 3 куб. м | 564,00 | 112,80 |
| 2 | Прицеп бортовой МАЗ-8926 1988 г. в., кузов (рама) № 872575, регистрационный знак 5161 АА-6 | 1 680,00 | 336,00 |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – **ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг электронных торгов** – 5 % от начальной цены лота. В случае отсутствия ставок участников торгов начальная цена торгов поэтапно снижается равными долями 5 (пять) раз до минимальной цены или до момента совершения ставок участниками торгов

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной торговой площадки «Индустрия Инноваций – Торги» https://iintorgi.by

**Срок заключения договора купли-продажи: не позднее 10 (десяти) календарных дней** со дня подписания протокола о результатах торгов

